КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №6 (182)
◂ 19 ЛЮТАГА ◂ 2010 г.
www.novychas.org

# Новы Час



**АЛЯКСЕЙ МАРАЧКІН**

Стар. 4

**ПЕРАТРУС У «НАРОДНАЙ ВОЛІ»**

Каля 40 хвілін доўжыўся ператрус у рэдакцыі незалежнай газеты «Народная воля». Яго ладзілі супрацоўнікі Ленінскага РУУС горада Мінска

Стар. 5

**НАШТО КАЗАХУ МЫТНЫ САЮЗ?**

Казахскае грамадства таксама не вельмі разумее сутнасць Мытнага саюза і хутчэй не давярае праекту, разглядаючы яго як змову палітычных элітаў Масквы і Астаны

Стар. 13

**АПОШНІ КАРОЛЬ**

Стар. 15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**ДЗЯРЖАЎНЫЯ НЕФАРМАЛЫ**

Нарыс Сяргея Нікалюка з цыклу «Азбука паліталогіі»

▸ **АД РЭДАКТАРА**

# ПОЛЬКА БЕЛАРУСКАЯ

Аляксей КАРОЛЬ

**«Паміж Польшчай і Расіяй — полька беларуская», — радок з вядомай песні на верш Леаніда Дранько-Майсюка ў выкананні Анатоля Ярмоленкі. Песня лёгкая і з добрым гумарам пра сур'ёзнае: пра нацыянальную самабытнасць беларусаў у сяброўстве з суседзямі. На жаль, зусім не такую палітычную полечку-трасуху танчаць зараз выканаўцы з уладнага ансамбля.**



Але, трэба ж, — па тэксту песні. «І ад печы да сяней» — дакладнае азначэнне памераў танцпляцоўкі: ад уладнай печы да гродзенскіх, брэсцкіх і гудагайскіх сяней з выхадам на Захад. «Колькі маем духу» — на ўсю моц, без перадыху. «Мы заскачам, як раней, / Полечку трасуху».

Менавіта «як раней». Без усялякіх там дэмакратычных «па» і ліберальных рэверансаў скачуць хлопцы ва ўніформе, ці то на плошчы Свабоды, ці то на Кастрычніцкай, ці то ў івянецкім Доме польскім. Партнёраў — пад дых і ў пастарунак. І пад суд: прыз за танец — штраф ды суткі. Аднолькава, што ў адносінах да беларускіх палякаў, што да беларускіх беларусаў.

Дзеля чаго? Каму выгадна? Хто балетмайстар?

Закуліссе беларускай палітычнай сцэны — зона закрытая. Але ўжо відавочна, што новы сілавы накат на Саюз палякаў, на мірную моладзь на плошчах Свабоды і Незалежнасці, на журналістаў, устаноўка ад Лідзіі Ярмошынай і Наталлі Пяткевіч СМІ пісаць пра выбары правільна — не ёсць асобныя, спантанныя імправізацыі.

Гэта цэласная кампазіцыя, якая ў спалучэнні ўсіх сваіх элементаў складае выразнае пасланне. Сваім і чужым. Наменклатуры: не расслабляцца, але ж за сябе не хвалявацца — улада непахісная. Апазіцыі — паслаблення не будзе. Захаду — пражывем і без вашага дыялога, прынамсі ў звязку з правамі чалавека.

І менавіта ўвесь Захад, Еўрасаюз, а не выключна Польшча — асноўны адрасат гэтага пасланння. Як у песні: «Між Літвой і Украіна / Полька беларуская!»

Навошта, здавалася, пры тым крызісным эканамічным стане ў Беларусі, ды яшчэ адразу ж пасля пазбаўлення часткі нафтавых прэферэнцый ад Расіі?

Высілкі беларускага аўтарытарнага рэжыму любымі спосабамі раскалоць, абмежаваць, нейтралізаваць дзейнасць грамадскіх аб'яднанняў не здзіўляюць. Саюз палякаў тут усяго толькі адна арганізацыя з дзесяткаў.

Хаця, зразумела, з шэрагу найбольш моцных, у тым ліку і дзякуючы падтрымцы польскай дзяржавы. Магчыма, гэта падтрымка ўяўляецца беларускім уладам занадта энергічнай. Але ж на тое ёсць відавочна сіметрычны адказ. Трымайце суседзі: на «карту паляка» — «карту беларуса», падтрымку беларускім асяродкам у Польшчы, аж да стварэння Саюза беларусаў.

Аднак тут якраз — стоп. Бо гэтыя беларускія асяродкі — у большасці сваёй — адмоўна ставяцца да сучаснага беларускага рэжыму. Як жа дапамагаць студэнтам-каліноўцам, выцесненых з бацькаўшчыны па палітычных матывах? Спробы беларускіх уладаў аддзяліць «сваіх» ад «чужых» у беларускай дыяспары поспеху не мелі.

Тактыка прымянення прэвентыўных сілавых мер па нейтралізацыі ўнутранага негвалтоўнага супраціву — істотны, аднак, на нашу думку, не самы галоўны матыў змены зместу полечкі-трасухі.

Падаецца, што гэта абвастрэнне паміж Мінскам і Варшавай спатрэбілася пэўным палітычным колам, як у беларускай кіроўнай эліце, так і — галоўнае — у расійскай. Невядомы палітычны балетмайстар ведаў, што рабіў.

Беларусь паміж Польшчай і Расіяй — гэта Беларусь паміж Захадам і Усходам.

Папросту Польшча на працягу некалькіх стагоддзяў апынулася на вастрыні гэтай геапалітычнай спрэчкі, у якой Беларусь аказалася разменнай манетай. На гэтым гістарычным разломе Польшча пацярпела паразу ад Расіі — Савецкага Саюза. А тут зноў стала выходзіць на ініцыятыўныя пазіцыі, прычым у новай якасці — дэмакратычнай краіны. І ў адной еўрапейскай супольнасці — Еўрапейскім саюзе.

Паслясавецкая ж Расія, на жаль, не стала дэмакратычнай і не пазбавілася імперскіх амбіцый. А тут дыялог. «Усходняе партнёрства». І Польшча наперадзе працэсу.

«Спыніць!» — патрабуе двухгаловы арол. Аднак геапалітычнае становішча самой Расіі ўжо далёка не тое. І эканамічнае таксама. Таму з усіх пазіцый лепш, калі свой заходні вектар адсячэ сама Беларусь — суверэнная і незалежная краіна.

Іншая справа, як гэтага дамагчыся. Пэўныя аргументы, відаць, знайшліся. Мы не ведаем дэталяў. Аднак ёсць адна красамоўная: пасля паразы ў барацьбе за нафтавыя прэферэнцыі афіцыйны Мінск не адказаў ні словам абурэння, як шмат-кроць здаралася на тле ўсіх папярэдніх газавых і малочных войнаў. Гучнае маўчанне. Накдаўн.

Сітуацыя падрыхтавана. Старт — захоп Дома польскага ў Івянцы літаральна напярэдадні афіцыйнага візіту міністра Мартынава да міністра Сікорскага. Два гады трывалі, а тут засвярбела. Ці не была гэта акцыя разлічана на зрыў візіту, які ўсё ж не быў адменены Варшавай? Што было пракаментавана некаторымі польскімі палітыкамі і аналітыкамі як памылка. А можа, якраз наадварот.

Канфлікт адносін па лініі Мінск–Варшава, шырэй — Беларусь–Еўрасаюз, пакуль не скончаны, скасаванне заходняга вектару па-ранейшаму пад прыцэлам. Працягваецца і эскалацыя рэпрэсій супраць апанентаў рэжыму, што працуе па сутнасці на тую ж мэту.

Дык што, наглядаем фінал танца пад назвай «Дыялог»?

У першапачаткова задуманай кампазіцыі — несумненна. Аднак нават беларускія танцоры рух не спыняюць: сп. Макей абвяшчае пра аднаўленне працы грамадска-кансультацыйнай рады, на прэс-канферэнцыю пад патранатам адміністрацыі запрашаюць і пару незалежных журналістаў, дзяржаўныя журналісты на чале са сп. Зімоўскім прыходзяць на сумесны з незалежнымі абед да кіраўніка місіі АБСЕ. Асцярожная такая полечка-трасуха.

Новай версіі ў працяг палітычнага танца «Дыялог» Еўрасаюз яшчэ не выпрацаваў. Мне падаецца, што недакладна быў абраны сам тэрмін і фармат — дыялог. Гэта занадта высокае азначэнне, якое і прадыктавала завышаныя чаканні і патрабаванні. На справе ж адбылося папросту аднаўленне міжнародных, найперш дыпламатычных, стасункаў краін Еўрасаюза з дзеючым у Беларусі рэжымам. У стандартным фармаце, які існаваў да высялення дыпмісій з Драздоў, да зводу А. Лукашэнкам Беларусі ў самаізаляцыю.

Гэты стандартны фармат прадугледжвае пэўныя адносіны не толькі з дэмакратычнымі, але і з аўтарытарнымі рэжымамі, не выключаючы і ўзнікнення канфліктных сітуацый з адпаведнымі палітычнымі дэмаршамі. І ўводзіць у зразумелыя для ўсіх, агульнапрынятыя формы адносіны заходніх палітыкаў і дыпламатаў з уладамі і апазіцыяй. Паасобку з кожным. Без прэтэнзій з усіх бакоў на сумесны дыялог. І цалкам здымае падставы для крытыкі на іх адрас накont выратавання рэжыму. Але ж і ўся адказнасць, у тым ліку маральная, у такім выпадку перамяшчаецца на іх саміх. Без спасылак на слабасць дэмакратычнай апазіцыі.

▸ РАДА

# КАНСАЛІДАЦЫЯ МАГЧЫМАЯ

**Кансалідацыя дэмакратычных сіл магчымая, калі ўсё будзе названа сваімі імёнамі. Пра гэта заявіў 15 лютага ў Мінску на сустрэчы з прадстаўнікамі грамадскай ініцыятывы «Рада беларускай інтэлігенцыі» палітык Аляксандр Казулін.**



Паводле яго слоў, выбары кіраўніка дзяржавы, што маюць адбыцца, «не будуць прахаднымі, а ўсё расставяць на свае месцы». Казулін мяркуе, што Рада беларускай інтэлігенцыі, у якую ўваходзяць аўтарытэтныя людзі, можа на аснове маральных законаў аб'яднаць здаровыя сілы краіны, якія жадаюць працаваць на ідэалы незалежнай дэмакратычнай Беларусі.

На думку акадэміка Аляксандра Вайтовіча, Рада беларускай інтэлігенцыі павінна паскорыць правядзенне кансультацый з лідэрамі дэмакратычных сіл, а пасля вылучэння адзінага кандыдата неабходна весці ўсю працу вакол гэтага чалавека. Адсутнасць сапраўднай кансалідацыі дэмакратычных сіл стала прычынай іх паразы яшчэ на першых прэзідэнцкіх выбарах 1994 года, лічыць ён.

Як адзначыў кінадраматург Уладзімір Халіп, большасць насельніцтва за перамены. І яны адбудуцца, калі адзіным кандыдатам ад дэмакратычных сіл на выбарах кіраўніка дзяржавы стане варты і мужны чалавек, які разумее, на што ідзе, і гатовы ўскласці на сябе цяжар гістарычнай адказнасці.

Старшыня Рады беларускай інтэлігенцыі Уладзімір Колас адзначыў, што пасля кансультацый з лідэрамі дэмакратычных сіл грамадская ініцыятыва распрацоўвае мадэль вылучэння адзінага кандыдата на прэзідэнцкіх выбарах і выбарчага блока, які павінен аб'яднаць усе здаровыя дэмакратычныя сілы краіны.

Рада прыняла заяву аб салідарнасці з неафіцыйным Саюзам палякаў на Беларусі і Саюзам беларускіх пісьменнікаў.

**Паводле БелаПАН**

▸ КОДЭКС

# АБНАЎЛЯЙЦЕ ПАШПАРТЫ

**Марыя КРУК**

**З 5 красавіка ўступае ў сілу візавы кодэкс Еўрасаюза. Цяпер, каб атрымаць візу для ўезду ў краіны ЕС, трэба мець мінімум дзве пустыя старонкі ў пашпарце, а сам дакумент мусіць быць выдадзены менш за дзесяць гадоў таму.**

Як паведаміў начальнік упраўлення па грамадзянстве і міграцыі ГУУС Мінгарвыканкама Ігар Ігнатовіч, артыкул 12 візавага кодэкса ЕС прадугледжвае, што грамадзянін, які хадайнічае аб атрыманні візы, павінен прадставіць сапраўдны дакумент на паездку, адпаведны тром крытэрам.

Тэрмін дзеяння дакумента павінен заканчвацца не раней за тры месяцы пасля меркаванай даты выезду з тэрыторыі краіны — сябра Еўрасаюза, у выпадку шматразовых паездак — пасля апошняй меркаванай даты выезду з тэрыторыі краіны — сябра ЕС. Ад гэтага правіла можна адступаць толькі ў выпадку належным чынам абгрунтаванай неадкладнай неабходнасці. Таксама ў дакуменце мусяць быць як мінімум дзве чыстыя старонкі, а выдадзены ён менш за дзесяць гадоў таму.

Супрацоўнікі турыстычных кампаній лічаць, што новаўвядзенне можа справакаваць невялікі адток турыстаў з краінаў Еўрапейскага саюзу. «Новыя патрабаванні ўскладняюць працу з кліентамі, — гаворыць Нэлі Меркуль, прадстаўніца адной са сталічных турфірмаў. — У Беларусі тэрмін дзеяння пашпарта працяглы, цяпер людзям давядзецца дадаткова траціць час на падрыхтоўку да падарожжа. Нас і так не надта любяць у краінах ЕС, бо консульскі збор для беларусаў, у адрозненні ад Расіі і Украіны, складае не 35, а 60 еўра. Новаўвядзенне адносна патрабавання да пашпартоў накладзе свой адбітак на сітуацыю. Канешне, калі чалавек можа патраціць грошы на набыццё пуцёўкі, то ён здольны і пашпарт памяняць. Але можа і адмовіцца ад лішніх клопатаў ды абраць краіну з больш простымі патрабаваннямі да ўезду, напрыклад, Егіпет, Турцыю ці тую ж Украіну».

Акрамя таго, для набыцця шэнгенскай візы давядзецца здаваць адбіткі пальцаў і добра абгрунтаваць неабходнасць шматразовай візы.

У склад Еўрапейскага саюза ўваходзяць 27 краін: Аўстрыя, Бельгія, Балгарыя, Вялікабрытанія, Венгрыя, Германія, Грэцыя, Данія, Ірландыя, Іспанія, Італія, Кіпр, Латвія, Літва, Люксембург, Мальта, Нідэрланды, Польшча, Партугалія, Румынія, Славакія, Славенія, Фінляндыя, Францыя, Чэхія, Швецыя, Эстонія.

▸ ДЗЕНЬ САЛІДАРНАСЦІ

# РАЗАГНАЛІ ЧАРГОВУЮ АКЦЫЮ

**Генадзь КЕСНЕР**

**Каля дзесятка моладзевых актывістаў былі затрыманыя ўвечары 16 лютага на Кастрычніцкай плошчы Мінска пры спробе адзначыць чарговы Дзень беларускай салідарнасці акцыяй у падтрымку прызнаных вязнямі сумлення былых ваўкавыскіх прадпрымальнікаў Мікалая Аўтуховіча і Уладзіміра Асіпенкі, а таксама актывіста зарэгістраванага ў Чэхіі Міжнароднага моладзевага аб'яднання «Малады фронт» Арцёма Дубскага.**

Затрыманні праводзіліся пераважна прэвентыўна, сама Кастрычніцкая плошча была літаральна запоўнена міліцыянтамі ў форме і ў цывільным. Гэтым разам яны нават не абцяжарваліся схаваць свае спецаўтобусы ў прылеглых да Кастрычніцкай плошчы дварах. Яшчэ да пачатку меркаваных падзеяў у журналістаў, што прыйшлі асвятляць падзею, запатрабавалі прадставіць пасведчанні, тым жа, хто іх не меў, запрапанавалі пакінуць плошчу "ад граху далей".

Тых актывістаў моладзевых дэмакратычных арганізацый, каму ўдалося з'явіцца на плошчы, адразу ж хапалі тры-чатыры міліцыянты ў цывільным і хуценька валаклі ў спецаўтобус ці ў пастарунак, які месціцца ля станцыі метро «Кастрычніцкая». Сярод затрыманых — вядомыя актывісты моладзевага дэмакратычнага



Photo.ByMedia.Net

руху Мікалай Дземідзенка, Артур Фінькевіч, Яўген Афнагель, іншыя маладзёны.

Міліцыянты перашкаджалі карэспандэнтам рабіць фота- і відэаздымкі таго, што адбываецца на плошчы, а вядомую фотажурналістку Юлію Дарашкевіч увогуле затрымалі і адвезлі ў пастарунак.

Варта адзначыць, то гэта ўжо чацвёрты «хапун» у Беларусі за апошнія тры дні.

▸ ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# ПРЫСЯГНУЎ БЕЛАРУСІ

**Алесь ЗАРЭМБЮК**

**13 лютага ў Слуцку прыняў вайсковую прысягу актывіст ПАГА «Рух «За Свабоду» Алег Пронскі. Ён быў адзіным, хто чытаў тэкст па-беларуску. Павіншаваць Алега прыехалі паплечнікі па руху, мама і сябры. Ён будзе служыць у ракетна-зенітных войсках у Слуцку.**

Алег Пронскі быў гвалтоўна прызваны ў войска. Яго з Мастоў накіравалі ў Слуцк для праходжання тэрміновай вайсковай службы. Каб суправадзіць Алега ў вайсковую частку, са Слуцку за ім прыехаў афіцэр і павёз толькі яго аднаго. Астатнія прызыўнікі з Мастоў будуць несці службу ў Гродна. Алег збіраўся вылучацца кандыдатам у дэпутаты Гродзенскага абласнога і Мастоўскага раённага Саветаў дэпутатаў.

Год таму, будучы студэнтам апошняга курса Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага універсітэта, Алег адмовіўся ад супрацоўніцтва з КДБ, пра што адкрыта заявіў у прэсе. Зараз Пронскі будзе служыць у вайсковай частцы № 08 851 56 ракетна-зенітнай брыгады.

«Адчуваю сябе добра. Ужо прывык да новага рэжыму жыцця. Ставяцца да мяне нармальна. Пакуль я прыехаў, ужо ўсе ведалі, хто я і чым займаўся ў цывільным жыцці. Бо звычайна за навенькімі афіцэраў не пасылаюць», — распавёў Алег Пронскі.

Даслаць Алегу паштоўку можна па адрасе: 223 610 , Мінская вобласць, г. Слуцк, вул. Гагарына в/ч 018 51 другі дывізіён.

▸ СМІ

# МЭТР ЖУРНАЛІСТЫКІ НАВЕДАЎ МІНСК

**Генадзь КЕСНЕР**

**На гэтым тыдні ў Мінску знаходзіўся адзін з самых вядомых шведскіх журналістаў Эрык Фіхтэліус. 15 лютага ў офісе ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» мэтр сустрэўся са сваімі беларускімі калегамі, а днём пазней выступіў з лекцыяй у Інстытуце журналістыкі Белдзяржуніверсітэта.**

Эрык Фіхтэліус вядомы беларускім журналістам перш за ўсё як аўтар падручніка «Дзесяць запаветаў журналістыкі», а ў сябе на радзіме — як знакаміты майстар журналісцкіх расследаванняў, радыё- і тэлежурналіст, які аддаў працы ў СМІ больш за сорак гадоў. Ён быў адным з самых папулярных рэпарцёраў рэдакцыі «Актуэльт» — праграмы навін першага каналу Шведскага тэлебачання (SVT1), а раней працаваў загадчыкам рэдакцыі



навін «Рэха» на Шведскім радыё, быў часовым прафесарам Інстытута журналістыкі, СМІ і камунікацыі пры Стакгольмскім універсітэце.

Кіраўніца сумеснага праекта шведскага інстытута павышэння кваліфікацыі журналістаў FOJO і ГА БАЖ Агнета Якабсан адзначыла, што Эрыка Фіхтэліуса дагэтуль пазнаюць у твар на вуліцах Стакгольма і іншых гарадоў Швецыі, хоць ён ужо колькі год не з'яўляецца на экранах тэлевізараў, бо займаецца пераважна адукацыйнай працай. Адкрытая лекцыя шведа ў офісе БАЖ зацікавіла каля двух дзесяткаў журналістаў, сярод якіх былі сябры як БАЖ, так і ГА «Беларускі саюз журналістаў».

Эрык Фіхтэліус зрабіў акцэнт на тым, што каштоўнасць праўдзівага факту вышэйшая за іншыя каштоўнасці. «Праўда мусіць даводзіцца да кожнага, незалежна ад наступстваў яе публікацыі, гэта значыць, што нават калі такая праўда можа нашкодзіць добрым людзям, яе нельга хаваць. Гэта могуць рабіць палітыкі, прапагандысты, супрацоўнікі прэс-служб, але толькі не журналісты», — падкрэсліў Эрык Фіхтэліус.

Паводле яго слоў, журналісты, у сваю чаргу, ні ў якім разе не маюць права выкрываць свае крыніцы інфармацыі. У Швецыі, напрыклад, прадугледжана нават крымінальная адказнасць для прадстаўнікоў уладных і сілавых структураў ужо толькі за тое, што яны хаця б запытаюцца ў журналіста, адкуль ён узяў тую ці іншую інфармацыю. Дарэчы, такая ж адказнасць прадугледжана і для самога журналіста, калі той назаве крыніцу інфармацыі насуперак яе жаданню.

Па словах Агнеты Якабсан, візіт Эрыка Фіхтэліуса ў Беларусь рыхтаваўся некалькі гадоў.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ХТО ПАДСТАВІЎ МІНІСТРА МАРТЫНАВА?

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Файнае кіно «Хто падставіў трусіка Роджэра?» даўно можна лічыць класікай кінематографа. Але працяг фільма можна здымаць ужо зараз, і ў Беларусі. У ролі трусіка, пэўна, выступіць кіраўнік Міністэрства замежных спраў Беларусі Сяргей Мартынаў. Бо менавіта яго зараз канкрэтна падстаўляюць. Які прастор для творчасці рэжысёраў «Беларусьфільма»!**



Photo.ByMedia.Net

15 лютага ў розных гарадах Беларусі былі затрыманыя актывісты і кіраўніцтва неафіцыйнага Саюза палякаў на Беларусі (СПБ) на чале з Анжалікай Борыс. Борыс аштрафаваная на 1 мільён 50 тысяч рублёў, прадстаўнікі кіраўніцтва Анджэй Пачобут, Ігар Банцар і Мечыслаў Яскевіч асуджаныя на пяць сутак арышту за арганізацыю 10 лютага ў Гродна несанкцыянаванага мітынгу ў падтрымку івянецкай арганізацыі СПБ.

Лідэр івянецкай арганізацыі Тэрэса Собаль абвінавачваецца ў захопе мясцовага Дома польскага, найбліжэйшым часам над ёй адбудзецца суд. Іск падаў старшыня афіцыйна зарэгістраванага СПБ Станіслаў Сямашка.

У сувязі з гэтым прэзідэнт Польшчы Лех Качыньскі накіраваў ліст Аляксандру Лукашэнку, у якім выказаў «сваю заклапочанасць і рашучы пратэст у сувязі з ростам рэпрэсій супраць Саюза палякаў на Беларусі». 16 лютага спікер польскага Сейма Браніслаў Камароўскі заявіў журналістам, што «ва ўмовах парушэння правоў чалавека на Беларусі ў Польшчы ёсць падставы сур'ёзна разгледзець магчымасць вяртання да палітыкі санкцый». Развіццё сітуацыі ў Беларусі «падрывае намаганні Еўрасаюза па наладжванні адносін з краінай». Пра гэта гаворыцца ў распаўсюджанай 16 лютага заяве вярхоўнага прадстаўніка ЕС па знешняй палітыцы, віцэ-старшыні Еўракамісіі Кэтрын Эштан.

Вось табе і «замарожванне санкцый», і «Усходняе партнёрства», і крэдыты з Захаду. Якія могуць быць стасункі з краінай ва ўмовах, калі на яе чыноўнікаў накладзеныя санкцыі? Ніякіх.

Дарэчы, раніцай 15 лютага былі затрыманыя не толькі палякі, але і старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька. Ён правёў больш за дзевяць гадзін у Валожынскім РАУС. Гэта значыць, што пра гвалтоўныя дзеянні ў адносінах да палякаў і да іншых грамадзян даведаюцца яшчэ і замежныя партнёры АГП. А іх занадта шмат, і ўсе яны маюць уплыў на сваю ўладу (а некаторыя пры ёй і знаходзяцца), і на кіраўніцтва Еўрасаюза.

І хай Мартынаў колькі заўгодна заяўляе, што арганізацыі павінны самастойна «вырашыць свае праблемы, у тым ліку праблемы з людзьмі, якіх не задаволіў вынік выбару кіраўніцтва», і што беларускі ўрад і Міністэрства замежных спраў «не займаюцца такімі пытаннямі». Гэта ён заявіў у інтэрв'ю польскай газеце «Rzeczpospolita» ад 10 лютага. Але затрымлівалі палякаў міліцыянты — прадстаўнікі ўлады. І асуджаныя палякі былі ўладай — беларускім судом і «імем Рэспублікі Беларусь». Тут ужо не скажаш, што ўлада не ўмешваецца ў справы арганізацый.

За тры дні супрацоўнікі міліцыі разагналі ў Мінску дзве мірных акцыі. У ходзе спробы зладзіць акцыю 14 лютага ў Мінску з нагоды Дня святога Валянціна былі затрыманыя 22 чалавекі, з іх чацвёра непаўналетнія. Здавалася б, што кепскага ў тым, што маладзёны пройдуць па вуліцах Мінска і павіншуюць людзей з Днём закаханых? Нічога. Але міліцыя вырашыла інакш. Затрыманні пачаліся акурат на месцы збору — на плошчы Свабоды.

Традыцыйная акцыя салідарнасці 16 лютага таксама была разагнана міліцыянтамі. Дарэчы, іх было значна больш, чым саміх «акцыянераў», бо ўдзельнікаў акцыі затрымлівалі яшчэ на падыходах да Кастрычніцкай плошчы. Навошта было збіваць людзей? Навошта было цягнуць дзяўчынак за валасы ў міліцэйскія аўтобусы? Навошта было, як сабакі за трусамі, ганяцца за фота- і відэаакрэспандэнтамі? Навошта схапілі журналістку «Нашай Нівы» Юлю Дарашкевіч?

Можа, супрацоўнікам міліцыі захацелася даказаць, якія яны «крутыя». У выніку гэтай «крутасці» пра гвалтоўныя дзеянні ўладаў даведаюцца ўсе партнёры міжнароднай моладзевай арганізацыі «Малады фронт» (якіх багата), партнёры аргкамітэта па стварэнні «Беларускай хрысціянскай дэмакратыі» (іх дэлегацыя якраз у гэтыя дні знаходзілася ў Нарвегіі), партнёры «Беларускай асацыяцыі журналістаў» (а прэса ў Еўропе мае значна большы ўплыў на кіраўніцтва, чым у Беларусі). Як апраўдвацца Мартынаву і казаць пра «лібералізацыю»?

Усім яскрава прадэманстравана: свабоды мірных сходаў у Беларусі — няма. Свабоды арганізацый і асацыяцый — няма. Свабоды слова — няма. Правы журналістаў — парушаюцца. Правы нацыянальных меншасцяў — парушаюцца. І гэта напярэдадні выбарчых кампаній, асабліва кампаніі ў мясцовыя саветы, на прыкладзе якой можна было б паказаць «лібералізацыю».

Падначаленыя міністра ўнутраных спраў Анатоля Куляшова моцна падставілі міністра замежных спраў Сяргея Мартынава. Можа, гэта і не было спланавана ў якасці «падставы», але нешта не верыцца, што Куляшоў не ведае пра дзеянні сваіх падначаленых. Бо затрыманні, напрыклад, палякаў праводзілі ўсе службы МУС — ад ДАІ да АМАПу. Не можа міністр унутраных спраў не ведаць пра такую «спецаперацыю»!

Падставілі не толькі МЗС, падставілі і беларускіх парламентарыяў. Якраз зараз абмяркоўваецца, у якім выглядзе беларускі парламент будзе прымаць удзел у парламенцкай асамблеі палітыкі Еўрасаюза «Усходняе партнёрства» (Еўранест). Дарэчы, 25–27 лютага ў Беларусь прыедзе місія Еўрапарламента, каб прыняць рашэнне аб фармаце беларускай дэлегацыі ў Еўранесце. А кіраўнік дэлегацыі Еўрапарламента хто? Паляк Яцэк Пратасевіч!

Дарэчы, у інтэрв'ю «Польскаму радыё» Пратасевіч не выключыў магчымасць, што з-за абвастрэння сітуацыі вакол Саюза палякаў ЕС пойдзе на «частковае замарожванне кантактаў з Мінскам». «Але калі ў Беларусі будуць рэалізоўвацца дэмакратычныя рэформы, то беларускія ўлады змогуць разлічваць на фінансавую дапамогу Еўрасаюза ў барацьбе з эканамічным крызісам», — сказаў польскі дэпутат.

Здаецца, не відаць Мартынаву, Беларусі і беларускаму парламенту ніякіх перспектыў у Еўрасаюзе, як сваіх вушэй без люстэрка. Але ўсё ж такі будзем спадзявацца, што «падстава» Мартынава скончыцца хэпі-эндам — як у стужцы пра трусіка Роджэра.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### ДАР'Я ДОМРАЧАВА




На зімовых Алімпійскіх гульнях адно з лепшых дасягненняў у беларускіх спартоўцаў на рахунку біятланісткі Дар'і Домрачавай. У спрынтэрскай гонцы біятланістак на 7,5 кіламетра Дар'я заняла 8-е месца. Залаты медаль заваявала славацкая біятланістка Анастасія Кузьміна, срэбны — немка Магдалена Нойнер, а бронзавы — француженка Мары Дарэн.

У інтэрв'ю журналістам беларуская спартоўка сказала, што змагла паказаць лепшую стральбу ў спрынце ў гэтым сезоне, але заняць больш высокае месца перашкодзіў мяккі снег, бо гонка праходзіла ў дажджлівае надвор'е. «Калі ж ацэньваць складанасць трасы, то яна няпростая, працоўная такая. Немагчыма нідзе паслабіцца, трэба захоўваць канцэнтрацыю і на спусках, і на паваротах», — цытуе біятланістку БЕЛТА.

Дар'я Домрачава нарадзілася ў 1986 годзе ў Мінску ў сям'і архітэктараў. Дзяцінства разам з бацькамі правяла ў сібірскім горадзе Нягань, дзе і пачала займацца лыжнымі гонкамі. З 1999 годзе спартоўка перайшла ў біятлон, і лічылася адной з самых таленавітых біятланістак і лыжніц. Пасля спартоўка атрымала запрашэнне ад старэйшага трэнера жаночай зборнай выступаць за Беларусь і з'ехала з Нягані. На той момант Домрачава ўжо была шматразовай чэмпіёнкай Расіі сярод юніёраў і прызёрам спаборніцтваў еўрапейскага ўзроўню. Першым буйным міжнародным стартам за зборную Беларусі стаў чэмпіянат свету сярод юніёраў 2005 года. У Кубку свету Домрачава дэбютавала ў 2006 годзе, а ў 2008–2009 пачала рэгулярна трапляць у дзесятку лепшых па выніках гонак.

### МІХАСЬ ПАШКЕВІЧ



Лідэра «Маладых дэмакратаў» Міхася Пашкевіча арганізацыя «Малады фронт» уганаравала прэміяй «Люблю Беларусь» за кампанію «За альтэрнатыўную службу». Пашкевіч з'яўляецца адным з ініцыятараў кампаніі, якая мае за мэту вырашыць праблему альтэрнатыўнай службы ў Беларусі ды ўрэшце даць грамадзянам краіны гарантаванае ім Канстытуцыяй права выбару, у якой форме аддаваць свой воінскі абавязак Радзіме.

Прэмію актывісту ўручалі 14 лютага падчас вулічнай акцыі на плошчы Свабоды ў Мінску. Але нацешыцца прэміяй Пашкевіч не паспеў: яго ды іншых удзельнікаў акцыі супрацоўнікі міліцыі затрымалі, збілі ды адвезлі ў пастарунак. Праз некалькі дзён камандзір палка міліцыі спецыяльнага прызначэння УУС Мінска Аляксандр Лукомскі вярнуў Пашкевічу статуэтку «Люблю Беларусь». Але асадак ад такога «свята», як гаворыцца, застаўся.

Міхась Пашкевіч — адзін з удзельнікаў «справы 14-ці», быў асуджаны да так званай «хатняй хіміі» за ўдзел у акцыях пратэсту прадпрымальнікаў зімой 2008 года. Летам 2009 года быў амніставаны. Яго ды іншых фігурантаў «справы 14-ці» міжнародная ўплывовая арганізацыя Amnesty International прызнала вязнямі сумлення.

### ГЕНАДЗЬ ХАЦЬКО



Чарговая крымінальная справа ў міліцэйскіх колах. Генеральная пракуратура распачала крымінальную справу ў дачыненні да былога начальніка Гродзенскай міліцыі генерал-маёра Генадзя Хацько. Яго падазраюць у злачынстве, прадугледжаным ч.1 арт. 424 Крымінальнага кодэкса — «перавышэнне ўлады або службовых паўнамоцтваў». Як паведамляе газета «Вечерний Гродно», расследаванне крымінальнай справы перададзена ў Гродзенскую абласную пракуратуру. Генадзь Хацько пад варту не ўзяты і ў дадзены момант яго месцазнаходжанне невядомае. Паводле наяўнай інфармацыі, сваякі звярнуліся з заявай пра яго знікненне. У лістападзе мінулага года Генадзь Хацько ўказам Лукашэнкі быў вызвалены ад пасады начальніка УУС Гродзенскага аблвыканкама. Таксама летась ад пасадаў былі вызваленыя начальнік упраўлення ўнутраных спраў Брэсцкага аблвыканкама палкоўнік міліцыі Віктар Краснічэнка і начальнік УУС Гомельскага аблвыканкама палкоўнік міліцыі Сяргея Шутаў.

▶ ТРЭЦІ СЕКТАР

# АЛЯКСЕЙ МАРАЧКІН

Аляксандр ТАМКОВІЧ



**Наша гутарка адбылася ў майстэрні вядомага мастака Аляксея Марачкіна (Алесь Мара), што месціцца ў знакамітым «Доме над Свіслаччу». Аляксей Антонавіч патлумачыў, што атрымаў яе яшчэ ў 1992 годзе пры кіраўніцтве Станіслава Шушкевіча. Дарэчы, гэта была апошняя майстэрня, пабудаваная на сродкі Саюза мастакоў пры падтрымцы дзяржавы. Сёння такое немагчыма, бо Марачкін не з тых, каму існуючая ўлада нешта дае ўвогуле. Акрамя гумовых палак, канешне…**

## Першыя колеры

Аляксей Марачкін нарадзіўся ў вёсцы Папоўшчына (Чэрыкаўскі раён Магілёўскай вобласці) 30 сакавіка 1940 года, на рэлігійнае свята мучаніка Аляксея, але памылкова ў пашпарце напісана — 10 сакавіка. Справа ў тым, што падчас ваенных закалотаў пасведчанне аб нараджэнні не захавалася. І ў школе дзень сваіх народзінаў ён назваў амаль наўгад, бо дакладна ведаў толькі год. Пазней спытаў у маці, калі адзначаецца «святы Аляксей», і пачуў — напрыканцы сакавіка, а калі паглядзеў царкоўны каляндар, то ўбачыў — 30-га.

Назва вёскі Папоўшчына для савецкай улады і яе ваяўнічага атэізму гучала непрывабна, таму вёску перайначылі ў Новую Слабаду, але ніхто яе так і не пачаў называць па-новаму.

Бацькі будучага мастака — Антон Мікалаевіч і Хадора Хролаўна. Імя маці даволі рэдкае. Так атрымалася, што літару «ф» у той мясцовасці не вымаўлялі. Яе як бы не было ўвогуле: Хведзя, хвасоля...

Часы вайны помняцца як праз сон, але дзіцячыя ўспаміны ўсё ж захаваліся. Прыгадаўся адзін з выпадкаў. Аднойчы Марачкін схаваўся ў жыта, каб лепш было глядзець на бойку паміж нямецкімі самалётамі і савецкімі «стракозамі» (іх называлі менавіта так), і ўбачыў, як за адным самалётам з'явіўся чорны дым. Выбуху не было. Прайшло больш за сорак гадоў, і калі пачалі асушаць балоты, знайшлі той самалёт. Расказвалі, што, як паднялі яго з вады, то ўбачылі — у торфу захавалася амаль усё. Загінуўшы савецкі лётчык быў як жывы. Пазней дазналіся яго імя і паставілі помнік.

А яшчэ запомнілася вяртанне з вайны бацькі. Было гэта раніцай. Ён прыйшоў з палявой вайсковай торбай за плячыма. Ніякіх трафеяў там, мабыць, не было. Адзінае, што з'явілася ў доме новае, — вялізны стос каляровых паштовак. Гэта былі рэпрадукцыі розных карцінаў.

## Захапленне фарбамі

Седзячы на печцы, патэнцыйны мастак любіў разглядаць тыя паштоўкі. Было вельмі цікава — Леанарда да Вінчы, Тыцыян, Рэмбрант... Пазней арыгіналы ён убачыць у розных музеях свету і заўжды будзе ўспамінаць тыя, з дзяцінства, паштоўкі. І той момант, калі захацелася нешта намаляваць самому.

Яшчэ ў школе ён марыў паступіць у мінскую вучэльню, якая рыхтавала мастакоў. Пасля ўступных экзаменаў тагачасны дырэктар Краснеўскі сабраў чалавек пяць-шэсць (сярод якіх быў і Аляксей Марачкін) і сказаў: усіх вас прыняць не магу, тым больш, што па конкурсу вы не праходзіце, раю ўзяць нашы экзаменацыйныя лісты і паехаць у Віцебск у мастацкі тэхнікум. Дарэчы, там калісьці спрабаваў вучыцца Васіль Быкаў. На той час там пачалася рэарганізацыя. Былы тэхнікум ператваралі ў мастацка-графічны факультэт Віцебскага педагагічнага інстытута. Так хлопцы і зрабілі.

На апошнім, чацвёртым, курсе пабраўся шлюбам. Вучыцца хацелася далей, але Аляксей добра ўяўляў, што наперадзе чакае армія, і таму як настаўнік па малюнку і чарчэнню ў 1962 годзе паехаў па размеркаванні ў глыбокае Палессе. У вёску Рубель Столінскага раёна.

Служыў пад Барысавам, у знакамітых Пячах. Калі прызываўся, на плячах трымаў эцюднік з фарбамі. Адзін з сяржантаў на размеркавальным пункце спытаў: ты што, на рыбалку сабраўся ці ў армію? Мабыць, гэта нагадала яму «скрыню» для зімовай рыбалкі. Давялося патлумачыць.

У «вучэбцы» навучылі кіраваць танкамі, аднак больш часу ён маляваў плакаты ў Доме афіцэраў. І маляваў добра, таму далей нікуды не адправілі. На адным з плакатаў замест «воин — будь бдителен» напісаў «воин — будь спокоен». Ніхто гэтага не заўважыў.

Арганізаваў для афіцэрскіх дзяцей студыю выяўленчага мастацтва. Дарэчы, сярод іх быў руды хлопчык Мікола Ісаёнак — сёння гэта вядомае прозвішча ў беларускім мастацтве.

Пасля войска вырашыў перабрацца бліжэй да Мінска. Працаваў два гады настаўнікам у СШ № 4 у Жодзіна. І паступіў у Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут.

Так атрымалася, што ў гэты час народны мастак Беларусі Іван Восіпавіч Ахрэмчык неафіцыйна (пра гэта студэнты даведаліся пасля), тайна ад Масквы (ведала толькі беларускае кіраўніцтва) адкрыў у БДТМІ, дзе быў загадчыкам кафедры, факультэт жывапісу. Афіцыйна ўсе паступалі на «дызайн і інтэр'ер», а неафіцыйна вучыліся зусім іншаму.

## Жыццёвыя сюжэты

Ахрэмчык ведаў, што Марачкін «ціхі дысідэнт», але імкнуўся не звяртаць на гэта асаблівай увагі. Наадварот, папярэджваў. Маўляў, трэба быць асцярожным, бо інакш вучобы не закончыць. На жаль, у гэтым Аляксей не быў паслухмяным. Дух супраціву натхняў і ўзбуджаў.

Цікавы выпадак. Усім студэнтам загадалі напісаць што-небудзь да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. Ён зрабіў «Смаленне чорнага кабана». Можна толькі ўявіць, які вэрхал падняўся. У рэктарат патэлефанавалі з Міністэрства асветы, і Марачкіна выклікалі ў адпаведныя інстанцыі. Але ён застаўся на сваіх пазіцыях, бо не бачыў ніякай крамолы ў сваім творы. Хапіла нават нахабства сказаць чыноўнікам, што «вождь» пралетарыяту любіў таксама паесці сала.

Перад дыпломам Марачкін паказаў свайму кіраўніку эскізы да карціны «Гуканне вясны», хацеў напісаць менавіта гэты твор. Традыцыйная беларуская тэма. Не тое, што рабіць яе забаранілі, проста параілі намаляваць іншае. Дакладней, Жодзінскі аўтазавод з яго магутнымі БелАЗамі.

А «Гуканне вясны» ён потым усё ж такі намалюе. Доўгі час гэта карціна будзе сярод пастаянных экспанатаў Нацыянальнага мастацкага музея, але прыйдуць «новыя кіраўнікі дзяржавы», і яе схаваюць. Гэтак жа адбылося і з карцінай «Вераніка і Максім», якую перад візітам Лукашэнкі ў «новы корпус музея» паслугачы рэжыму хуценька прыбралі з экспазіцыі.

Па вялікаму ж рахунку, Аляксей Марачкін лічыць сябе прадстаўніком незапатрабаванага пакалення, бо ў яго маладосці трэба было маляваць толькі так, як загадала КПСС. А ён ніколі не працаваў «на заказ». Не маляваў ні Леніна, ні Маркса з Энгельсам. На карцінах Марачкіна — іншыя героі: Францыск Скарына, Кірыла Тураўскі, Рагнеда, Ефрасіння Полацкая, Вітаўт Вялікі, Іван Луцкевіч, Цётка…

Сёння за нешта падобнае, магчыма, атрымаў бы (калі б сябраваў з уладай) дзяржаўную прэмію, але Марачкін імкнецца абысціся без такой ласкі. У 90-я гады, калі Саюз мастакоў вылучаў яго на званне заслужанага дзеяча мастацтва, прынцыпова адмовіўся.

## Палітра жыцця

Магчыма, гэта задужа пафасна, але з гадамі Марачкін пачаў разумець, што МЫ — НАРОД, НАЦЫЯ і, каб не згубіцца ў свеце, павінны не забываць, адкуль і хто мы. Творчы арыенцір ён узяў на этнаграфічнасць і гістарычныя партрэты. Нават у нейкім сэнсе абмежаваў у сабе пошукі «чыстага мастацтва».

У 1990 годзе пры Саюзе мастакоў Беларусі была створана суполка «Пагоня». Менавіта «пры», бо ад самастойнай рэгістрацыі амаль адразу яны адмовіліся. Таму што ў нашай дзяржаве гэта стварае вельмі шмат праблем.

Марачкін быў маральна падрыхтаваны да перабудовы, і таму цалкам лагічна тое, што менавіта яго прызначылі загадчыкам кафедры жывапісу Беларускай акадэміі мастацтва. Дагэтуль ён займаўся вольнай творчасцю і некалькі гадоў быў галоўным мастаком у мастацкім фондзе БССР — адказваў за мастацка-ідэйны ўзровень таго, што рабілася ў нашых вытворчых майстэрнях.

На гэтай пасадзе Аляксей Марачкін пратрымаўся крыху больш за 10 гадоў. Новыя ўлады выціснулі з пасады загадчыка кафедры, і, на яго погляд, паступілі неразумна, бо тым самым як бы падштурхнулі запоўніць нішу нонканфармізму, мастацтва супраціву. Марачкін пачаў маляваць карціны тыпу «Плошча Каліноўскага», «Звычайны нацюрморт» і г. д. Знакаміты Звон волі — гэта таксама Марачкін і яго аднадумца скульптар Шатэрнік.

У 2005 годзе Аляксея Марачкіна абралі Старшынёй Рады Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына» (угаварылі паэт Генадзь Бураўкін і акадэмік Радзім Гарэцкі), якім прабыў да лета мінулага года. Пасада вельмі значная для грамадскай біяграфіі Марачкіна, аднак менавіта ён быў адным з тых, хто сустрэў рэформы апошняга часу вельмі насцярожана, і, як лічыць сёння, мякка кажучы, расчараваны яе дзейнасцю.

Перш за ўсё таму, што адчуў хвалю так званай «управляемой оппозиции». На яго думку, залішне многае сёння вырашаецца таемна, у нейкім закуліссі.

Найбольш яскрава гэта праявілася падчас правядзення апошняга з'езда. 21 арганізацыя (цягам года) адмовілася даць памяшканне для яго правядзення. Марачкін агучыў, што іх гатовыя прыняць у Вільні, і раптам пытанне было вырашана. Многія ўспрынялі гэта як «кароткі павадок».

У тым, што для правядзення з'езда лепш за ўсё было абраць Вільню, куды б маглі прыехаць беларусы, якія да не спадобы існуючай уладзе (Івонка Сурвіла, напрыклад), Аляксей Марачкін упэўнены і сёння. Як і ў тым, што «Бацькаўшчыне» нельга працаваць пад нечым кантролем. Пакінем гэта без каментараў. Адзначым толькі, што ёсць і супрацьлеглая думка.

Як і многія, Аляксей Марачкін пытаецца ў сябе: «Навошта мастаку палітыка?» І разумее, што не можа інакш, бо вельмі востра рэагуе на падман, знявагу, цемрашальства. Можа, у іншых гэтае адбываецца інакш. Ён не вінаваціць тых мастакоў, пра якіх некалі склаў такія радкі: «Штодня малюю хмызнякі і застаюся на вякі...» Толькі адны хмызнякі ён маляваць не зможа ніколі. Мастаку не да душы фальш, якая адчуваецца паўсюдна. Асабліва ў культурнай палітыцы. На жаль, сёння з усяго беларускага (мова, культура) робіцца звычайны сувенір. Каб было што паказаць за мяжой — зубры, буслы, ручнікі і таму падобнае.

Аляксей Марачкін. Алесь Мара. Мастак. Паэт. Грамадскі дзеяч. Асоба — ва ўсіх сваіх іпастасях. І ва ўсіх — выбітная. Адзін з найбольш заўважных архітэктараў беларускага адраджэння хвалі 1990-х, беларускага трэцяга сектару, ён сам па сабе — трэці сектар. Як у Хемінгуэя: кожны чалавек — мацярык. Тым больш такі, такога маштабу і таленту, як Аляксей Марачкін.

Ён не можа схавацца пад стол, пад падушку альбо зрабіць выгляд, быццам нічога не адбываецца. Не змагаецца за нейкую пасаду, але і не парывае з Народным Фронтам, у якім з самага пачатку існавання. Мастак не можа здрадзіць сваім думкам і стаць на калені перад цемрай. І галоўнае — Аляксей Марачкін не адзін такі.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ПЕРАТРУС У «НАРОДНАЙ ВОЛІ»

Генадзь КЕСНЕР

**Каля 40 хвілін доўжыўся 17 лютагаператрус у рэдакцыі незалежнай газеты «Народная воля». Яго ладзілі супрацоўнікі Ленінскага РУУС горада Мінска на чале з маёрам Аляксандрам Чуем, які складаў і падпісваў пратакол вобшуку і вымання сістэмнага блока кампутара журналісткі выдання Марыны Коктыш.**

«Як высветлілася, нарэшце дакацілася гэта рэха «паляўнічай справы», па якой 17 лютага павінен быць вынесены прысуд. Пакрыўджаны экс старшыня УКДБ Гомельскага вобласці (на момант пачатку гэтай справы) і цяперашні старшыня УКДБ Гродзенскай вобласці Іван Корж шукаюць тых, хто на яго ўзвёў паклёп. Дакладней, па яго заяве шукае міліцыя. Вусна гаварылася, што не спадабаліся Каржу артыкулы на сайтах «Хартыя–97» і «Беларускі партызан», але ў выніку канфіскавалі кампутар Марыны Коктыш», — напісала ў сваім блогу намесніца галоўнага рэдактара «Народнай волі» Святлана Калінкіна.

Як паведамляе сама рэдакцыя «Народнай волі», «упершыню беларуская грамадскасць даведалася пра «паляўнічую справу» 29 красавіка 2009 года. На нарадзе, прысвечанай працы праваахоўных органаў, прэзідэнт паведаміў: «У поле зроку КДБ нядаўна трапіў начальнік аддзела па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі Жлобінскага РАУС Леанід Мінянкоў, які арганізаваў умовы для палявання, рыбалкі і яшчэ таго-сяго. Устаноўлена, што ў 2003 годзе ён набыў і аформіў на падстаўную асобу сядзібу плошчай больш за два гектары на тэрыторыі Жлобінскага раёна, захапіў пры гэтым яшчэ больш за адзін гектар лясных угоддзяў, самавольна ўзвёў 14 пабудоў, абзавёўся зграяй з 29 пародзістых сабак і трыма дзікамі. Усю гэтую гаспадарку абслугоўвалі мясцовыя жыхары. На ўласнай базе рэгулярна ажыццяўляліся паляванне, рыбалка з удзелам кіраўнікоў, у тым ліку Беларускага металургічнага завода, і высокапастаўленых службовых асоб органаў унутраных спраў, напрыклад начальніка галоўнага ўпраўлення па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі МУС Ермакова».


www.nv-online.info

Слуханні крымінальнай справы ў дачыненні да службовых асоб МУС праходзілі ў закрытым рэжыме ў Вярхоўным судзе з 12 кастрычніка 2009 года. Фігурантамі з'яўляюцца былыя начальнік галоўнага ўпраўлення па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі МУС Віктар Ермакоў, начальнік УБКіЭЗ УУС Гомельскага аблвыканкама Аляксандр Малаеў, начальнік УБКіЭЗ СН УУС Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый Баранаў і начальнік АБКіЭЗ Жлобінскага РАУС Леанід Мінянкоў. Усе яны абвінавачваюцца ў перавышэнні ўлады (арт. 426 КК). У крымінальнай справе фігуруюць таксама іншыя грамадзяне, якія абвінавачваюцца ў незаконным паляванні (размова ідзе пра здабыванне еўрапейскай рысі, занесенай у Чырвоную кнігу) і бяздзейнасці службовых асоб. Справа аб незаконным паляванні і перавышэнні ўлады аб'яднаны ў адну вытворчасць».

Хутка пасля таго, як стала вядома пра ператрус у «Народнай волі», у рэдакцыю пачалі прыбываць журналісты розных незалежных мас-медыя, а таксама сябры праўлення і юрысты ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў», замежныя дыпламаты.

Як распавяла сама Марына Коктыш, ранкам у сераду яе дапыталі ў якасці сведкі па крымінальнай справе, заведзенай па артыкуле Крымінальнага кодэксу «Паклёп» у дачыненні да службовых асоб КДБ. «Я была адной з тых журналістак, што сустракаліся са сваякамі міліцыянтаў, якіх зараз судзяць. Вось, у прынцыпе, і ўсё, — кажа журналістка. — Сваякоў таксама дапыталі па крымінальнай справе, і, верагодна, яны назвалі журналістаў, з якімі яны сустракаліся. Інфармацыя была размешчана на сайтах «Хартыі'97» і «Беларускі партызан», у «Народнай волі» нічога не было. Пасля таго, як мяне дапыталі ў якасці сведкі, яны прыехалі ў рэдакцыю канфіскоўваць кампутар, каб праверыць, ці не з яго інфармацыя пайшла на тую ж «Хартыю». Але ніякай інфармацыі я нікуды не адпраўляла».

Дзіўна паводзілі сябе міліцыянты, якія прыбылі разам з маёрам Чуем. Яны спрабавалі забараніць журналістам карыстацца мабільнай сувяззю, здымаць працэс апісвання кампутара Марыны Коктыш і складання пратаколу. Калі аднаго з «праваахоўнікаў» запыталі, на падставе якога закона забараняецца весці здымкі, той на імгненне знiякавеў, а потым адказаў: «У нас свае законы». Як кажуць, без каментараў.

Галоўнага рэдактара «Народнай волі» Іосіфа Сярэдзіча абурыла тое, якім чынам пачынаўся сам ператрус. «Яны наляцелі, бы нейкія каршуны, без усялякага папярэджання, нават не зайшлі да мяне як кіраўніка выдання. Мяне выклікаў карэспандэнт Віталь Гарбузаў у той пакой, дзе працуюць журналісты. Я запрасіў міліцыянтаў у свой кабінет, але яны адмовіліся, на адлегласці ў метр паказалі мне нейкую паперку, маўляў, ёсць пастанова, паказвайце месца. Я адказаў, што пры такім падыходзе ніхто з супрацоўнікаў газеты не пакажа вам месца, дзе стаіць кампутар Марыны Коктыш. А калі вы пойдзеце патрашыць усе працоўныя месцы, гэта будзе гвалт. Толькі пасля гэтага яны прыйшлі ў мой кабінет, я ўслых прачытаў у прысутнасці журналістаў пастанову, якраз зайшоў і Андрэй Бастунец. Пасля гэтага я сказаў, што мне ўсё зразумела, на падставе закона я не маю права вам адмовіць, ідзіце і працуйце. Тут і сама Марына з'явілася. Яны канфіскавалі кампутар Марыны і з'ехалі, нават не зайшлі перад гэтым у мой кабінет, хоць я іх і прасіў пра гэта», — распавёў Іосіф Сярэдзіч.

На думку намесніка старшыні ГА БАЖ юрыста Андрэя Бастунца, існуюць усе падставы для таго, каб абскардзіць такія дзеянні супрацоўнікаў міліцыі. «Застаецца пытанне: а наколькі значнымі былі падставы меркаваць, што тут знаходзяцца тыя ці іншыя матэрыялы? Бо такім чынам можна рабіць ператрусы ў любым памяшканні, дзе ёсць кампутар. І заўважу, што гэта адбываецца па справе, звязанай з замахам на гонар і годнасць асобы, рашэнне ў дачыненні да якой ужо было вынесена і грамадзянскім, і агульным судом. І тое, што гэта зараз пераводзіцца ў крымінальны характар, паказвае ўзровень свабоды слова ў Беларусі, а таксама магчымасці службовых асоб задзейнічаць сілавыя ведамствы для вырашэння сваіх праблем», — падкрэсліў намеснік старшыні ГА БАЖ.

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# «ДЖЭНТЛЬМЕНСКІ» НАБОР БЕЛАРУСКАЙ ПАЛІТЫКІ

Вольга ХВОІН

**Шаноўныя чытачы, дазвольце павіншаваць вас з заканчэннем «лібералізацыі». На змену зацішшу зноў прыйшлі арышты, ператрусы і затрыманні.**

За два тыдні лютага былі разагнаныя мітынгі ў падтрымку польскай меншасці, затрыманыя дзесяткі чалавек. Кіраўніца непрызнанага Саюза палякаў Анжаліка Борыс атрымала штраф, а на рэдактарку незарэгістраванай газеты «Glos znad Niemna na uchodzstwie» Ірэну Валюсь быў складзены пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні.

Затым у Мінску разагналі штогадовую «акцыю любові» незарэгістраванага ў Беларусі «Маладога Фронту». Між іншым, кіраўніцтва арганізацыі планавала ў гэты дзень ціха-мірна ўручыць прэміі «Люблю Беларусь», але кіраўніцтва гатэлю «Кроўн Плаза» адмовіла ў арэндзе памяшкання, і моладзь выйшла на вуліцу, як і ў папярэднія гады. У выніку на плошчы Свабоды ў Мінску спецназ



някепска паразмяўся, не выбіраючы каго — дзяўчат ці хлопцаў — груба валачы па асфальце ў аўтобус. Праз колькі гадзін усіх затрыманых (больш за два дзесяткі чалавек) адпусцілі без складання пратаколаў. Гэтак жа жорстка была разагнана традыцыйная акцыя салідарнасці з палітычнымі вязнямі на Кастрычніцкай плошчы.

І як бяльмо на воку ва ўсіх гэтых падзеях журналісты. Здымаюць, пішуць, спрабуюць паказаць нам з вамі, нашым суседзям, што Беларусь — гэта не толькі блакітныя азёры. Таму за кожным здымаючым журналістам на вулічных акцыях ходзіць каманда з дзябёлых мужыкоў, якія кідаюцца на фотаапараты, камеры, перашкаджаючы працаваць, а калі трэба, то і наўпрост параюць «не высоўвацца». Пасля акцыі салідарнасці 16 лютага па сеціве разышоўся фотаздымак, на якім бравыя хлопцы ў цывільным душаць фатографа Associated Press Сяргея Грыца. Фатографа «Нашай нівы» Юлію Дарашкевіч, нягледзячы на наяўнасць службовага пасведчання, завезлі ў пастарунак. «За сумленную працу», як выказаўся калега. Міліцыя на ўсе скаргі на такое беззаконне дае няўцямныя адказы. А чыноўнікі з вышэйшых эшалонаў улады расказваюць пра тое, што СМІ шукаюць «клубнічку» ды «жаўцізну», гавораць, што палітычныя кампаніі разглядаюць як «праверку сродкаў масавай інфармацыі на маральнасць і прафесіяналізм». І ні слова пра арышт супрацоўніка «Белсату» Івана Шульгі, пра перашкоды, якія робіцца ў працы журналістам недзяржаўных СМІ.

Ці азначаюць усе гэтыя падзеі, што дыялогу Беларусі з Еўрапейскім саюзам капец — невядома. ЕС — далёка, і яго чыноўнікам нешта з беларускага кантэксту не бачна, а нешта і не хочацца бачыць. Адрэагаваць на падзеі прымусіў канфлікт з польскай меншасцю, што перасягнуў мяжу Беларусі. Старшыня Еўрапарламента Ежы Бузэк прызнаў, што ў Беларусі «парушэнні правоў чалавека не датычаць толькі польскай меншасці». Палітык заявіў, што бачыць два варыянты развіцця сітуацыі ў дачыненнях з Беларуссю: першы — афіцыйны Мінск адмовіцца ад палітыкі пераследу прадстаўнікоў нацыянальных меншасцяў і дэмакратычных арганізацыяў, і тады будзе мець магчымасць надалей браць удзел у разнастайных праграмах ЕС. Другі — далейшы рост напружанасці і вяртанне да санкцыяў, у тым ліку візавых і эканамічных.

Таксама была агучаная заява Высокага прадстаўніка ЕС па пытаннях замежных спраў і палітыкі бяспекі, віцэ-прэзідэнта Еўрапейскай Камісіі Кэтрын Эштан аб сітуацыі з Саюзам палякаў на Беларусі, у якой яна падкрэсліла, што ўмовай поспеху двухбаковых адносін з'яўляюцца крокі ўладаў Беларусі ў бок дэмакратызацыі і выканання правоў чалавека. Да слова, на 26–27 лютага ў Беларусь запланаваны візіт дэлегацыі дэпутатаў Еўрапейскага парламента, якія правядуць кансультацыі наконт фармату ўдзелу Беларусі ў парламенцкім вымярэнні «Усходняга партнёрства» (Еўранест).

Па логіцы, таптанне правоў суайчыннікаў мусіла б выклікаць рэзананс у грамадстве, але ўсе маўчаць. І справа не столькі ў манаполіі дзяржаўных СМІ — цяпер не тыя часы, калі было складана здабыць інфармацыю. Проста зручна адседжвацца на сваіх прыгрэтых месцах, не рызыкаваць і не высоўвацца. А пра зняважаны гонар і бяспраўе ўспамінаць толькі тады, калі самога працягнуць па асфальце.

ЭКАЛОГІЯ

# ПА НОВЫМ КОЛЕ

## ПРАЕКТ БУДАЎНІЦТВА БЕЛАРУСКАЙ АЭС ЗНОЎ РАЗАБРАЛІ НА ХІБЫ

Вольга ХВОІН

**Шэраг недзяржаўных арганізацый распачалі правядзенне грамадскай экалагічнай экспертызы праекта будаўніцтва АЭС у Беларусі. Спецыялісты з Беларусі, Украіны і Расіі апелююць да эканамічнай і экалагічнай немэтазгоднасці праекта і спадзяюцца, што іх пазіцыя будзе пачутая ва ўладных структурах.**






Аднак ужо цяпер ініцыятыўная група сутыкнулася з праблемай дэфіцыту інфармацыі. У снежні мінулага года грамадскае аб'яднанне «Экадом» звярнулася ў Міністэрства энергетыкі, Міністэрства прыродных рэсурсаў і Дырэкцыю будаўніцтва атамнай электрастанцыі з запытам прадставіць неабходную дакументацыю, а таксама інфармацыю пра тэрміны правядзення Дзяржаўнай экалагічнай экспертызы праекта будаўніцтва АЭС. Па словах кіраўніцы аб'яднання Ірыны Сухій, інфармацыі яны дагэтуль не атрымалі: запыт увесь час перакідваецца з адной інстанцыі ў другую. Пераадольваць сцяну непаразумення з мясцовым кіраўніцтвам ініцыятары грамадскай экалагічнай экспертызы збіраюцца абходнымі шляхамі — праз арганізацыі з іншых краін.

Восенню 2009 года да грамадскіх слуханняў у Астраўцы з нагоды пабудовы атамнай станцыі экспертамі беларускай партыі «Зялёныя», групы «Экаабарона», руху «Навукоўцы за без'ядзерную Беларусь», грамадскага аб'яднання «Экадом» былі падрыхтаваныя крытычныя заўвагі да «Заявы аб магчымым уздзеянні на навакольнае асяроддзе (АУНА) беларускай АЭС». У высновах дакумента сцвярджалася, што «распрацоўшчыкі не змаглі забяспечыць прадстаўленне ў матэрыялах АУНА своечасовай, поўнай і сапраўднай інфармацыі аб плануемай дзейнасці і яе ўздзеянні на навакольнае асяроддзе і здароўе людзей». У дзень грамадскіх слуханняў наклад з матэрыяламі крытычных заўваг быў канфіскаваны, а адзін з яго аўтараў расійскі інжынер-фізік Андрэй Ажароўскі быў арыштаваны на некалькі сутак.

### Няпоўная эканоміка

Падчас адкрытага пасяджэння камісіі грамадскай экалагічнай экспертызы праекта беларускай АЭС было заяўлена, што абгрунтаванне неабходнасці будаўніцтва станцыі ў Беларусі праведзена некарэктна. У прыватнасці няправільна ацэненыя сучасныя тэндэнцыі сусветнай энергетыкі, у Беларусі няма тэндэнцыя да росту энергаспажывання, да таго ж не ўлічана неабходнасць адаптацыі энергасістэмы Беларусі да з'яўлення новай буйной крыніцы энергіі. «Праекціроўшчыкі сыходзяць з таго, што будзе расці спажыванне электраэнергіі. Аднак прагнозы паказваюць, што ў Беларусі не чакаецца рэзкага росту энергаспажывання, тым больш што дзейнічае адпаведная праграма па энегазберажэнню, якая прадугледжвае павелічэнне выкарыстання альтэрнатыўных крыніц энергіі», — падкрэсліў сябра экспертнай рады Аляксей Яблыкаў, член-карэспандэнт Расійскай акадэміі навук, прафесар, кіраўнік «Праграмы па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы» міжнароднага Сацыяльна-экалагічнага саюза.

Эксперты прыйшлі да высновы, што праект будаўніцтва станцыі неабгрунтаваны і з эканамічнага боку. «У Расіі атамная энергетыка атрымлівае датацыі з бюджэту, частка з іх наўпрост прапісана ў бюджэце, частка — схавана. У такой сітуацыі апынецца і Рэспубліка Беларусь, калі раптам абзавядзецца атамнай энергетыкай. Гэта з'ява, якая прызнана эканамістамі ва ўсім свеце, — сцвярджае інжынер-фізік, каардынатар праектаў міжнароднай групы «Экаабарона» Андрэй Ажароўскі. — Канчатковы кошт будаўніцтва атамнай станцыі часта бывае істотна вышэйшы за першапачатковы варыянт. Прычына гэтага простая: заяўлены кошт — дэмпінгавы. Вытворцам атамнай энергетыкі выгодна паказаць, што іх дзейнасць быццам бы эканамічна апраўданая, таму першапачатковы кошт заяўляецца вельмі нізкім. Яркі прыклад — незавершанае будаўніцтва еўрапейскага рэактара. Кошт яго будаўніцтва ўжо падыходзіць да таго, каб быць большым у два разы за заяўлены. І няма канца і краю дадатковым выдаткам, якія нясе кампанія, што будуе гэтую станцыю».

Навуковец звяртае ўвагу, што ў кошт атамнай энергіі не ўключаюцца два віды расходаў. Першае — выдаткі на вывад станцыі з эксплуатацыі. У якасці прыкладу прыводзілася Літва, якая не можа вывесці з эксплуатацыі Ігналінскую АЭС за свой кошт і бярэ на гэту працэдуру грошы ў Еўрасаюза. Таксама ў беларускім праекце ў кошт энергіі не ўваходзіць абыходжанне з радыеактыўнымі адкідамі, няма ацэнкі эканомікі магчымай адпраўкі адпрацаванага радыеактыўнага паліва на перапрацоўку ў Расію і вяртанне адкідаў перапрацоўкі назад у Беларусь ды будаўніцтва адмысловых магільнікаў для яго захоўвання. «Калі ўлічыць усе гэтыя моманты, то праект будзе нятанны не толькі з экалагічнага пункту гледзішча, але і з эканамічнага», — падкрэслівае Ажароўскі.

### І людзям, і рыбам

Аўтары папярэдняга заключэння грамадскай экалагічнай экспертызы праекта будаўніцтва беларускай атамнай электрастанцыі звяртаюць увагу, што ў Беларусі няма адпаведнай нарматыўнай базы, якая б рэгулявала развіццё атамнай энергетыкі. Размова ідзе пра адсутнасць закона аб абыходжанні з радыеактыўнымі адкідамі і адпрацаваным ядзерным палівам. Не вырашана пытанне і пра адказнасць дзяржавы і арганізацыі, якая эксплуатуе станцыю, за магчымыя шкоды. «У нормах радыяцыйнай бяспекі не знайшлі адлюстраванне апошнія навуковыя дадзеныя пра ўздзеянне малых доз радыяцыі, — гаворыцца ў дакуменце. — Апроч таго, нормы радыяцыйнай бяспекі заснаваныя на «мадэлі» ўплыву радыяцыі на белага здаровага мужчыну 20-ці гадоў — гэта значыць, не ўлічваецца ўздзеянне на больш уразлівыя пола-ўзроставыя і этнічныя групы (дзеці, жанчыны, іншыя расы)». Экспертная рада прыйшла да высновы, што тэхналогія вода-вадзяная рэактара, які і мяркуецца пабудаваць у Беларусі, — небяспечная: «АЭС 2006» на аснове новага тыпу рэактарнай установкі (ВВЭР–1200) нідзе ў свеце не была пабудавана і не была выпрабавана на практыцы. Беларусі прапануецца стаць выпрабавальным палігонам Росатама».

Паводле разлікаў навукоўцаў, АЭС вылезе бокам не толькі чалавеку. Іхтыёлаг, каардынатар праектаў CCB Coalition Clean Baltic па захаванні Атлантычных ласосяў у Беларусі Ніна Палуцкая сцвярджае, што будаўніцтва атамнай станцыі ў раёне Віліі справакуе знікненне ў Беларусі рэдкіх відаў рыб (атлантычных ласосяў), якія прыходзяць сюды на нераст. «У Заяве аб магчымым уздзеянні на навакольнае асяроддзе няма падліку шкоды ў грашовым эквіваленце, які можа нанесці будаўніцтва станцыі каштоўным відам рыб у рацэ Вілія і яе прытоках. І гэта неабходна зрабіць. Але нават без такой адзнакі цалкам зразумела, што існаванне атлантычных ласосяў знаходзіцца пад пагрозай знікнення з тэрыторыі Беларусі», — гаворыць навуковец.

### Беларуская АЭС патрэбная Расіі

Падчас паседжання экспертнай рады яе ўдзельнікі перайшлі ад пытанняў лакальных да сусветнага значэння. Прафесар, член-карэспандэнт Расійскай акадэміі навук, кіраўнік Праграмы па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы Міжнароднага сацыяльна-экалагічнага саюза Аляксей Яблыкаў заявіў, што «праз шэсць месяцаў пасля запуску атамнага рэактара, у прыватнасці тыпу ВВР, у паліве назапашваецца плутоній, які можна выкарыстоўваць для вытворчасці ядзернай зброі». «Па Канстытуцыі, Беларусь з'яўляецца бяз'ядзернай дзяржавай. Канстытуцыйны суд тлумачыць, што бяз'ядзерны статус краіны тычыцца толькі ядзернай зброі. Але ён не ўлічыў рэальнай сувязі атамных рэактараў з атамнай зброяй», — гаворыць прафесар Яблыкаў.

Навуковец сцвярджае, што будаўніцтва беларускай атамнай станцыі найперш выгодна расійскім атамшчыкам. Менавіта таму заплюшчваюцца вочы на многія недахопы праекту. «Расійскія атамшчыкі атрымаюць крэдыт на 4–5 мільярдаў долараў. Кіраўніцтву Беларусі гэта таксама выгодна, бо яно забярэ частку з гэтых грошай. Як яно імі будзе распараджацца, невядома, пытанні адносна мэтазгоднасці выкарыстання гэтых сродкаў пачнуцца пасля, а цяпер краіне неабходныя рэсурсы. Чаму Расія згодная выдаць такі крэдыт? Будаўніцтва АЭС неверагодна моцна прывяжа Беларусь да Расіі. Пастаўка атамнага паліва — Расія, абыходжанне з адкідамі — Расія. Дзіўна, што вашы спецыялісты не думаюць пра сітуацыю, якая склалася ў Арменіі, калі краіна не змагла аплаціць утылізацыю адпрацаванага паліва і набыццё новага. Расія фактычна атрымала ў кошт доўгу Армянскую АЭС. Гэта сітуацыя цалкам можа паўтарыцца ў Беларусі», — перасцерагае Аляксей Яблыкаў.

Сябры экспертнай рады не ўпэўненыя, што іх голас будзе пачуты ў вышэйшых эшалонах Беларусі, але спадзяюцца, што адмоўнае заключэнне экалагічнай экспертызы будзе вядомым шырокаму колу людзей і, магчыма, некага спыніць у прынцыпі рашэнняў. Пакуль жа экспертная рада збіраецца «будаваць камунікацыю з уладамі так, каб яе было складана ігнараваць».

## 26 ЛЮТАГА, ПЯТНІЦА

---

**05.20** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Фігурнае катанне. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00** Навіны.
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрэсаў.
**09.05** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**10.00** Меладрама «Сёстры па крыві».
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**12.05** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Дзённік Алімпіяды.
**12.30** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Фрыстайл. Мужчыны. Фінал.
**13.55** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Фігурнае катанне. Жанчыны.
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Сямейная сага «Ярмолавы» (Расія).
**16.25** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**17.35** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.30** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Дзённік Алімпіяды.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Дэтэктыўны серыял «Ліквідацыя».
**21.00** Панарама.
**22.00** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Хакей. Паўфінал. Прамая трансляцыя.
**00.30** Авантурны трылер «Афёра» (ЗША).
**02.05** Дзень спорту.

---

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 01.05** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**10.00** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Чакай мяне». Беларусь.
**11.50** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Віёла Тараканава. У свеце злачыннага запалу». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік».
**19.00** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Музычны суд».
**22.25** Наша «Белараша».
**23.00** Драма «Парыж!Парыж!».
**01.20** Навіны спорту.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Меншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Інструктар». Серыял.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.45** «Званая вячэра».
**12.40** «Былая». Серыял.
**13.50** «Сакрэтныя гісторыі».
**14.45** «Элен і рабяты. Лепшыя серыі». Моладзевы серыял. Заключныя серыі.
**15.35** «Выкраданне багіні». Серыял.
**16.50** « Асабісты інтарэс».
**17.20** «Меншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Былая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.40** Фільм «Не абуджаеце спячага сабаку». ЗША, 1996г.
**22.55** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Гарачы лёд».
**23.30** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.10** Фільм «Дрэнны Санта». Германія-ЗША.
**01.40** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

---

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.05** У гэты дзень.
**09.10** Жансавет.
**09.40** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.40** Дэтэктыўны серыял «Непераможны» (Расія). 1-4-я, заключная, серыі.
**14.15** Мультсерыял «Сямейка піратаў» (Францыя). Заключныя серыі.
**15.05** Свая музыка. Працяг.
**15.35** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ» (Францыя-Бельгія-Швейцарыя).
**16.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.30** Усё аб бяспецы.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Пра мастацтва.
**19.30** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**20.15** Бітва экстрасэнсаў.
**21.25** Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010. Біятлон. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**23.25** Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010. Горналыжны спорт. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**00.45** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Агляд.
**01.35** Прэм'ера. Крымінальны трылер «Выплыць з віра» (Францыя).
**03.20** Дакументальна-пазнавальны фільм «Гісторыя форта Баярд» (Францыя).
**04.10** Пасоўванне+.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Адночы будзе каханне».
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.25** Тэлесерыял «Райскія яблычкі. Жыццё працягваецца». Расія, 2009 г.
**13.15** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** «Два бакі адной Ганны». Тэлесерыял.
**15.15** Тэлесерыял «Неадкладка».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Кулагін і партнёры».
**17.55** Прэм'ера. «Кармеліта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Адночы будзе каханне».
**20.30** Тэлесерыял «Райскія яблычкі. Жыццё працягваецца». Расія, 2009 г.
**22.25** Навіны - Беларусь.
**22.35** Фільм «Жаночае сяброўства». Расія.
**00.25** «Выпрабавальнікі. Выжыць у авіякатастрофе». Дакументальны фільм.

### НТВ

**07.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.30** «Іх норавы».
**09.05** «Алтар Перамогі».
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.50** «Дачны адказ».
**11.50** Серыял «МУР ёсць МУР-2».
**12.40** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**13.30** Серыял «Тэрыторыя прыгажосці».
**15.10** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Мядзведжы кут».
**21.30** Прэм'ера. Дэтэктыўны трылер «Оксфардскія забойствы».
**23.30** Містычны дэтэктыў «Барвовыя рэкі-2: Анёлы апакаліпсісу».

### EUROSPORT

**04.00** Фрыстайл. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Акрабатыка.
**05.00** Фігурнае катанне. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. Адвольная праграма.
**07.00** Фрыстайл. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Акрабатыка.
**07.30, 08.15, 09.15** Зімовыя Алімпійскія гульні. Навіны.
**07.40** Лыжнае дваяборства. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. 10 км.
**08.25** Лыжныя гонкі. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. 4х5 км. Эстафета.
**09.25** Фігурнае катанне. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. Адвольная праграма.
**11.00** Лыжныя гонкі. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. 4х5 км. Эстафета.
**12.00** Лыжнае дваяборства. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. 10 км.
**13.00** Зімовыя Алімпійскія гульні. Фінішная прамая. Часопіс.
**13.30** Фігурнае катанне. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. Адвольная праграма.
**14.30** Лыжныя гонкі. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. 4х5 км. Эстафета.
**15.15** Лыжнае дваяборства. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. 10 км.
**16.00** Зімовыя Алімпійскія гульні. Фінішная прамая. Часопіс.
**16.30** Лыжныя гонкі. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. 4х5 км. Эстафета.
**17.30** Фігурнае катанне. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. Адвольная праграма.
**19.00** Зімовыя Алімпійскія гульні. Фінішная прамая. Часопіс.
**19.30** Зімовыя Алімпійскія гульні. Зваротны адлік. Часопіс.
**20.00** Горныя лыжы. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. Слалам. Спроба 1.
**21.15** Біятлон. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны 4х7,5 км. Эстафета.
**23.00** Горныя лыжы. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. Слалам. Спроба 1.
**23.30** Горныя лыжы. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. Слалам. Спроба 2.
**00.30** Бабслей. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Чацвёркі. Ванкувер (Канада).
**01.45** Сноўборд. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. Паралельны гіганцкі слалам.
**02.15** Кёрлінг. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. Фінал. Ванкувер (Канада).

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.10** На колах.
**17.35** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**18.20** Форум: «Нябачная вайна».
**19.00** Еўрапейскі Звяз без сакрэтаў: «Вакол Кіева».
**19.25** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.30** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.40** Беларусы ў Польшчы.
**20.00** Невядомая Беларусь: «Першая катастрофа», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**20.35** Госць «Белсату».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Пад абцасам», камедыя, 2005 г.
**22.40** Аб'ектыў.

## 27 ЛЮТАГА, СУБОТА

---

**06.50** Дакументальна-пазнавальны серыял «Афрыка. Магічны кантынент» (Францыя).
**07.20** Існасць.
**07.45** Дзень спорту.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.05** Здароўе.
**09.40** Дэтэктыўны серыял «Шпікі раённага маштабу-2» (Расія).
**10.30** Шпілька.
**11.05** Ранішняя хваля.
**11.45** «OFF STAGE LIFE».
**12.10** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Дзённік Алімпіяды.
**12.30** Дакументальны фільм «Афіцэры. Невядомая версія» (Украіна).
**13.20** Кінараман «Афіцэры» (СССР).
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Вакол планеты.
**16.10** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**17.10** Відэафільм АТН «Буда-Кашалёўскія майстры» цыклу «Зямля беларуская».
**17.25** Відэафільм АТН «Кабякова Вольга» цыклу «Лёгка сказаць».
**17.55** «Ваша лато».
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Зорныя танцы. Мужчынскі сезон. Перадача 3-я.
**21.00** Панарама.
**21.40** Прэм'ера. Драма «Выгнанне» (Расія).
**00.30** Уласнай персонай.

---

**07.00** «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?» (Расія), 2005 год.
**09.45** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** «Сустракайце - Чэлентана!».
**12.10** АНТ прадстаўляе: Тэлечасопіс «Звяз».
**12.40** Анімацыйны фільм «Кураня Цыпа».
**14.05** «Кінаметры вайны».
**14.35** Мастацкія фільм «Чакай мяне, Ганна!».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Суботні «Ералаш».
**16.45** Камедыя «Модная матуля».
**18.55** «Адзін супраць усіх».
**19.55** «Чакай мяне». Беларусь.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Цудоўная пяцёрка».
**22.15** «Вялікая розніца».
**00.05** «Пражэктарпэрысхілтан».
**00.35** Канцэрт групы «Любэ».

---

**06.55** «Агенцтва 2». Камедыйны серыял.
**07.45** Фільм «Пінокія». ЗША- Італія, 2002г.
**09.30** «Культурнае жыццё».
**10.00** «Крокі да поспеху».
**10.55** «Мінск і мінчане».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Новыя падарожжы дылетанта».
**13.50** Фільм «Камедыя памылак». СССР, 1978г.
**16.20** «Наша справа».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.40** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**17.30** «Вялікі горад».
**18.00** Фільм «Права на надзею». Украіна, 2008г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.30** Фільм «Горад грахоў». ЗША, 2005г.
**23.50** Фільм «Спартанец»». ЗША - Германія, 2004г.
**01.35** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

---

**04.30** Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010. Хакей. Паўфінал. Прамая трансляцыя.
**07.00** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**07.30** Усё аб бяспецы.
**07.55** Тэлепорт.
**08.20** Нашы тэсты.
**08.55** Жансавет.
**09.35** Свая кампанія.
**10.20** Лабірынты: Катранская пушча.
**10.50** «Запал па культуры».
**11.30** Вострасюжэтны серыял «Афіцэры-2» (Расія). 1-3 серыі.
**14.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Чэлсі-Манчэстэр Сіці. Прамая трансляцыя.
**16.45** Прэм'ера. Дакументальны фільм «Вандомская плошча. Свет раскошы» (Францыя).
**17.45** «3 жыцця мінскіх губернатараў». Дакументальны фільм (Беларускае тэлебачанне).
**18.10** Гістарычная драма «Царскае паляванне» (СССР-Італія- Чэхаславакія). 1-я і 2-я серыі.
**20.35** «Зоркі гумару». Гумарыстычная праграма (Расія).
**21.40** Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010. Лыжныя гонкі. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**23.50** Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010. Горналыжны спорт. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**01.25** Казанова.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Прэм'ера. «Паўночнае ззянне Фёдара Абрамава». Дакументальны фільм.
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.25** Фільм «Толькі ўдваіх».
**13.00** «Пакой смеху».
**14.00** Весткі.
**14.30** Фільм «Жаночае сяброўства». Расія, 2007 г.
**16.20** «Пакой смеху».
**17.00** «Ты і я». Канцэрт.
**19.00** Весткі ў суботу.
**19.45** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**20.20** «Суботні вечар».
**22.05** Прэм'ера. Фільм «Шукаю цыбе». Расія, 2010 г.
**23.55** Фільм «Упершыню замужам».
**01.40** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**07.00** Сёння.
**07.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.25** «Авіятары».
**08.55** «Агляд».
**09.25** «Без рэцэпту».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Асабліва небяспечны!».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.30** «Жаночы погляд».
**14.20** Прэм'ера. Прыгодніцкі баявік «Міраж».
**16.00** Сёння.
**16.30** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.05** «Праграма Максімум».
**21.15** «Руская сенсацыі».
**22.10** «Ты не паверыш!».
**23.10** Баявік «Банда Келі».
**01.00** Прэм'ера. Прыгодніцкая камедыя «Мядовы месяц Каміла».

### EUROSPORT

**04.00** Шорт-трэк. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. 500 м. Жанчыны. 1000 м. Ванкувер (Канада).
**05.30** Хакей на лёдзе. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. 1/2 фіналу.
**07.00** Шорт-трэк. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. 500 м. Жанчыны. 1000 м. Ванкувер (Канада).
**07.30, 08.15, 09.15** Зімовыя Алімпійскія гульні. Навіны.
**07.40** Горныя лыжы. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. Слалам. Спроба 2.
**08.25** Біятлон. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны 4х7,5 км. Эстафета.
**09.25** Хакей на лёдзе. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. 1/2 фіналу.
**10.25** Горныя лыжы. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. Слалам. Спроба 2.
**11.30** Біятлон. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны 4х7,5 км. Эстафета.
**13.00** Зімовыя Алімпійскія гульні. Фінішная прамая. Часопіс.
**13.30** Горныя лыжы. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. Слалам. Спроба 2.
**14.30** Біятлон. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны 4х7,5 км. Эстафета.
**16.00** Зімовыя Алімпійскія гульні. Фінішная прамая. Часопіс.
**16.30** Горныя лыжы. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. Слалам. Спроба 2.
**17.30** Біятлон. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны 4х7,5 км. Эстафета.
**19.00** Зімовыя Алімпійскія гульні. Фінішная прамая. Часопіс.
**19.30** Зімовыя Алімпійскія гульні. Зваротны адлік. Часопіс.
**20.00** Горныя лыжы. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Слалам. Спроба 1.
**21.00** Біятлон. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны 4х7,5 км. Эстафета.
**21.45** Лыжныя гонкі. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. 30 км класічным стылем. Мас-старт. Ванкувер (Канада).
**23.15** Сноўборд. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Паралельны гіганцкі слалам. Ванкувер (Канада).
**23.45** Горныя лыжы. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Слалам. Спроба 2.
**00.45** Бабслей. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Чацвёркі. Ванкувер (Канада).
**01.30** Канькабежны спорт. Зімовыя Алімпійскія гульні. Гонка пераследу. Камандныя спаборніцтвы. Ванкувер (Канада).
**02.15** Кёрлінг. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Фінал. Ванкувер (Канада).

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.10** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**17.40** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**18.25** «Бульбаны», мультсерыял.
**18.35** Чалавек і вайна: «1945. год, які змяніў свет», дак. фільм, 2005 г., Вялікабрытанія: 5 серыя.
**19.25** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.30** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.40** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**19.55** «Дзень «Ч». Версія», дак. фільм, 2009 г., Беларусь, ч. 1.
**20.25** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.10** Суботні сеанс: «Эфект матыля–2», маст. фільм, 2006 г., ЗША.
**22.40** Аб'ектыў.

## 28 ЛЮТАГА, НАДЗЕЛЯ

**07.20** Фільм-казка «Міо, мой Міо» (СССР-Нарвегія-Швецыя).
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.05** «Арсенал».
**09.35** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**09.50** Альманах вандраванняў.
**10.15** Культурныя людзі.
**10.55** У свеце матораў.
**11.30** Nota Bene.
**12.05** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Дзённік Алімпіяды.
**12.30** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Фігурнае катанне. Паказальныя выступы.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**15.55** «У чаканні Мундыяля».
**16.25** Прэм'ера. Прыгодніцкая камедыя «Лапухі» (Расія).
**18.00** Суперлато.
**19.15** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**20.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**20.50** «КЕНО».
**21.00** «У цэнтры ўвагі».
**22.15** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Хакей. Фінал. Прамая трансляцыя.
**00.45** Крымінальная камедыя «Такое жыццё» (Італія).
**02.30** «Залаты лёд Страдзівары». Канцэртная праграма.
**03.25** «Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010». Цырымонія закрыцця. Прамая трансляцыя.
**05.30** «У чаканні Мундыяля».

**07.00** «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?» (Расія), 2005 год.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.05** Фазэнда.
**11.40** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**12.15** «Дзве славы салдата і акцёра».
**13.15** «Песні Перамогі».
**13.45** Фільм «Вялікая змена».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Фільм «Вялікая змена». Працяг.
**18.45** «Здабытак Рэспублікі».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**21.40** «Здабытак Рэспублікі». Працяг.
**23.25** Прэм'ера. Фільм «Залегчы на дно ў Бругге».

### СТВ

**07.10** «Агенцтва 2». Камедыйны серыял.
**08.00** Фільм «Не абуджаеце спячага сабаку». ЗША, 1996 г.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.55** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Добры дзень, доктар!».
**13.45** «Дарагая передача».
**14.00** Фільм «Сабачае сэрца». СССР, 1988 г.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.20** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень».
**20.40** Фільм «Белфегор - здань Луўра». Францыя, 2001г.
**22.30** «Прафесійны бокс».
**23.25** Фільм «Грыль-бар «На паўдарогі». Германія, 2002г.
**01.20** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**05.00** Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010. Хакей. Матч за 3-е месца. Прамая трансляцыя.
**07.30** Дабравест.
**07.55** Мір вашай хаце.
**08.05** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**08.35** Меладрама «Мілы, дарагі, каханы, адзіны…» (СССР).
**09.55** Школа рамонту.
**11.00** Медычныя таямніцы.
**11.45** Кінаспробы.
**12.05** Бухта капітанаў.
**12.40** «Правы чалавека».
**12.55** Гаспадар.
**13.25** Вострасюжэтны серыял «Афіцэры-2» (Расія). 4–8, заключная, серыі.
**18.15** Нашы тэсты.
**18.50** Экспедыцыя.
**19.25** Алімпійскія гульні. Ванкувер-2010. Лыжныя гонкі. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**22.15** Тэлебарометр.
**22.35** Свая музыка. Працяг.
**23.05** Пасоўванне+.

### РОССИЯ

**07.00** «Здабытак рэспублікі».
**07.30** «Ты і я». Канцэрт.
**09.15** Фільм «Шукаю цябе». Расія, 2010 г.
**11.00** Весткі.
**11.10** «Сам сабе рэжысёр».
**12.00** Фільм «Самы паволны цягнік».
**13.30** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**14.45** Прэм'ера. «Вясёлыя рабяты. Дунаеўскія». Дакументальны фільм.
**15.45** Музычная камедыя «Вяселле ў Малінаўцы».
**17.30** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**19.00** Весткі тыдня.
**20.05** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**20.40** Прэм'ера. «Танцы з Зоркамі». Сезон - 2010.
**23.00** «Адмысловы карэспандэнт».
**00.00** Фільм «Выпадковы спадарожнік».
**01.35** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.10** Прыгодніцкі баявік «Міраж».
**07.30** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Дзікі свет».
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.50** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Алтар Перамогі».
**14.15** Рамантычная камедыя «Законы прываблівасці».
**16.00** Сёння.
**16.25** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**17.25** «І зноў добры дзень!».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** Сёння. Выніковая праграма.
**19.55** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.30** Дэтэктыўны серыял «УГРО».
**00.15** «Авіятары».

### EUROSPORT

**04.00** Лыжныя гонкі. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. 30 км класічным стылем. Мас-старт. Ванкувер (Канада).
**05.00** Хакей на лёдзе. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Матч за 3-е месца. Ванкувер (Канада).
**07.30** Зімовыя Алімпійскія гульні. Навіны.
**07.40** Канькабежны спорт. Зімовыя Алімпійскія гульні. Гонка праследу. Камандныя спаборніцтвы. Ванкувер (Канада).
**08.15** Зімовыя Алімпійскія гульні. Навіны.
**08.25** Горныя лыжы. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Слалам. Ванкувер (Канада). Спроба 2.
**09.15** Зімовыя Алімпійскія гульні. Навіны.
**09.25** Фігурнае катанне. Зімовыя Алімпійскія гульні. Паказальны выступ. Ванкувер (Канада).
**11.00** Горныя лыжы. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Слалам. Ванкувер (Канада). Спроба 2.
**11.45** Лыжныя гонкі. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. 30 км класічным стылем. Мас-старт. Ванкувер (Канада).
**13.00** Зімовыя Алімпійскія гульні. Фінішная прамая. Часопіс.
**13.30** Фігурнае катанне. Зімовыя Алімпійскія гульні. Паказальны выступ. Ванкувер (Канада).
**15.00** Лыжныя гонкі. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. 30 км класічным стылем. Мас-старт. Ванкувер (Канада).
**16.00** Зімовыя Алімпійскія гульні. Фінішная прамая. Часопіс.
**16.30** Фігурнае катанне. Зімовыя Алімпійскія гульні. Паказальны выступ. Ванкувер (Канада).
**17.45** Лыжныя гонкі. Зімовыя Алімпійскія гульні. Жанчыны. 30 км класічным стылем. Мас-старт. Ванкувер (Канада).
**18.30** Зімовыя Алімпійскія гульні. Фінішная прамая. Часопіс.
**19.00** Зімовыя Алімпійскія гульні. Зваротны адлік. Часопіс.
**19.30** Лыжныя гонкі. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. 50 км класічным стылем. Мас-старт. Ванкувер (Канада).
**21.45** Хакей на лёдзе. Зімовыя Алімпійскія гульні. Мужчыны. Ванкувер (Канада). Фінал.
**01.00** Зімовыя Алімпійскія гульні. Фінішная прамая. Лепшыя моманты. Часопіс.
**02.00** Фігурнае катанне. Зімовыя Алімпійскія гульні. Паказальны выступ. Ванкувер (Канада).
**03.30** Зімовыя Алімпійскія гульні. Цырымонія закрыцця. Ванкувер (Канада).

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.20** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.20** Дакументальная гадзіна: «Урок беларускай мовы», дак. фільм, 2006 г., Польшча.
**19.10** «Бульбаны», мультсерыял.
**19.25** Англійская мова з Ліпі і Мэсі.
**19.30** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.40** «У аблозе», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**19.55** МакраФон.
**20.30** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня).
**21.30** Фільматэка майстроў: «Рухомы замак Гаўла», анімацыйны фільм, 2004 г., Японія.

# Шаноўныя чытачы!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску. Падпісацца можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

БЕЛПОЧТА ф. ПС 112

ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012211080010 фил. МГД ОАО «Белинвестбанк», код 153001764, УНН 190790926
г. Минск, ул. Коллекторная, 11

КУДА ____
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ____
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ____

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ____________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у аддзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)

Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|

Период подписки указывает абонент

Плательщик

Пеня ______
Всего ______

Кассир

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

Новы час

www.novychas.org

ЦІКАВА

# ГАВАРЫЦЕ СА МНОЙ НА БАЛАЧЦЫ

Іван БІЧ

**У школах Краснадарскага краю маюць намер пачаць выкладаць у школах прадмет «балачка». Балачка — своеасаблівы дыялект кубанскіх казакоў.**



Нагрудны знак кубанскіх казакоў

Балачка, ці балаканне, — гэта паўднёва-ўсходнія (стэпавыя) дыялекты ўкраінскай мовы, якія развіваліся самастойна на Доне і Кубані ў тым ліку пад вялікім уплывам рускай мовы. Існуюць тры асноўныя гістарычныя разнавіднасці балачкі — кубанская, данская і горская.

Пачнём з данской. Гістарычная блізкасць Украіны да Данскога казацтва прывяла да сталых міграцый украінцаў на Дон і да распаўсюду там украінскіх дыялектаў. Галоўная адзнака данскай балачкі — моцнае змякчэнне зычных гукаў. У выніку ўзнікла мясцовая гаворка, якую носьбіту рускай мовы вельмі цяжка зразумець. Вось прыклад гаворкі, на якой размаўлялі на Доне ў пачатку XX стагоддзя (арфаграфія арыгінала): «*Я зарас встрену за баляс казачий, давичи втрелси с терцами, погутарили тадася вон я зарас и поведал шшё донцы дюжа с терцами личут, токмо наблиз иде та с низовыми донцами… Черизвычай старообрядцы, альбо с предвеку скочевались кактысь*».

Яшчэ больш балачка была пашырана на Кубані, дзе на ёй размаўлялі перасяленыя з Запарожскай Сечы казакі. Кубанская балачка, па словах навукоўцаў, найбольш блізкая да літаратурнай украінскай мовы. Аднак графіка і арфаграфія, як правіла, выкарыстоўваецца руская. Цікава, што перапісам 1897 года гэты дыялект нават аднеслі да ўкраінскай мовы.

Вось прыклад кубанскай балачкі: «*Э, хлопче, у нас говорыть ни як не можно. Сапач так Сапач, а жежь ты не скажешь мини своей настоящей хвамилии, таких я богато, як ты бачив, а як шо и после цего ты за Сапача мини будыш гавкать, так я тобя прикажу пятьдесят батогив отпустыть в то мисто, виткиль ноги растут. Иды соби с Богом. Хочышь курень строй, а ны хочышь — черт с тобой*».

Горская балачка адрозніваецца прыкметным каўказскім (у першую чаргу адыгейскім) уплывам. Каўказскі субстрат нават выцясняе першапачатковы ўкраінскі, Леў Талстой у сваіх казацкіх апавяданнях згадвае асабліваці лексікі горскіх казакоў: «ружжо» — «флінта», «забіць» — «замордовать», «бабуля» — «бабука», «маці» — «мамука», «сястра» — «нянюка» і г.д.

Казакаў адносяць да субэтнасаў расійскага народа (усяго іх 16). Аднак літаратурныя помнікі былі толькі на балачцы і на мове архангельскіх памораў. Гэта дало падставу для заклікаў стварыць на базе балачкі казацкую мову.

У 1918 годзе атаман Пётр Красноў прапанаваў надаць балачцы статут афіцыйнай мовы Данской Рэспублікі нароўні з рускай, што не мела, аднак, шырокай падтрымкі. Стварэнне данской (казацкай) літаратурнай мовы было прыпынена.



У 1918 годзе атаман Пётр Красноў прапанаваў надаць балачцы статут афіцыйнай мовы Данской Рэспублікі нароўні з рускай, што не мела, аднак, шырокай падтрымкі

Выкарыстанне балачкі ў СССР абмежавалася выкананнем фальклорных песняў, у тым ліку славутай «Распрагайце, хлопцы, коні». Пэўным цэнтрам захавання моўнай традыцыі выступіў кубанскі казацкі хор, спецыялісты якога рабілі этнаграфічныя экспедыцыі ў пошуках новых народных твораў. У побыце балачка ўжываецца пераважна пажылымі станічнікамі. Сярод моладзі балачка лічыцца мовай калгаснікаў.

У пачатку 1990-х гадоў узніклі групы энтузіястаў, што выступалі за адраджэнне балачкі. Яны дабіліся стварэння на кубанскім тэлебачанні асобнай праграмы на балачцы і паступова працуюць над кадыфікацыяй граматычных правіл. Апошняй іхняй перамогай стала рашэнне мясцовых уладаў уключыць вывучэнне балачкі ў школьную праграму. Пакуль, аднак, яе будуць вывучаць факультатыўна.

Супраць гэтай ідэі, дарэчы, ужо ўзнікла апазіцыя ў выглядзе выкладчыкаў рускай мовы. Яны баяцца, што вучні пачнуць усім класам «гэкаць» і «шокаць». Некаторыя кажуць, што лепш дадаткова вывучаць замежныя мовы, чым выміраючы дыялект. Нарэшце, шмат хто бачыць у адраджэнні балачкі палітычныя гульні. Кубанскія ўлады пад сусам адраджэння казацкай культурнай спадчыны змагаюцца з помнікамі савецкіх часоў. Гэта не падабаецца камуністам.

Аднак нават пачатак грамадскай дыскусіі па праблеме мясцовых дыялектаў — гэта ўжо вялікая перамога прыхільнікаў балачкі. Асабліва з улікам апошніх намераў Масквы абмежаваць вывучэнне ў школах моваў малых этнасаў Расійскай Федэрацыі.

Цікавы таксама падыход да балачкі ва Украіне. Тут да гэтага часу папулярная думка пра тое, што кубанцы, нашчадкі запарожскіх казакоў, — этнічныя ўкраінцы. Сапраўды, украінскі элемент быў вельмі моцным на Кубані да пачатку 1930-х гадоў. Паводле дадзеных перапісу 1926 года, палова жыхароў Кубані лічыла сябе ўкраінцамі. У краі працавала некалькі навучальных устаноў з выкладаннем прадметаў на ўкраінскай мове, выходзілі ўкраінскамоўныя газеты, па-ўкраінску вялося справаводства і г.д.

Аднак падчас калектывізацыі чамусьці вырашылі русіфікаваць усе г. зв. украінскамоўныя раёны. Прычым асаблівая пастанова ЦК ВКП(б) і СНК СССР ад 14 снежня 1932 года патрабавала зрабіць гэта рэкордным тэмпамі — да 1 студзеня 1933-га. Рэдакцыям украінскамоўных кубанскіх газет было дадзена ўсяго тры дні, каб наладзіць іх выпуск па-руску. Такая татальная антыўкраінская кампанія дала свае вынікі. Паводле ўсесаюзнага перапісу 1959 года, украінцаў у Краснадарскім краі пражывала ўсяго 3,9 працэнта.

Намеры рэабілітаваць балачку ва Украіне горача віталі. Нават факультатыўная балачка для ўкраінскай інтэлігенцыі — перашкода працэсам поўнай асіміляцыі Кубані. Аднак праблема ў тым, што балачка, так ці інакш, украінска-рускі дыялект, прычым вельмі падобны на «суржык» (украінскі падвід трасянкі). Той самы «суржык», які смяротна ненавідзіць украінская інтэлігенцыя, што вітае адраджэнне балачкі. Для інтэлектуалаў суржык — мова каланізацыі ўкраінскай вёскі.

Ці не выклікае адраджэнне балачкі цікавасць да феномена суржыку, на якім, калі верыць матэрыялам Кіеўскага міжнароднага інстытута сацыялогіі ад 2003 года, размаўляюць 12 працэнтаў жыхароў Украіны? Тым больш, што суржык — арганічны кампанент шматлікіх твораў сучаснай украінскай літаратуры.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

На працягу некалькіх тыдняў рэжым Лукашэнкі правярае трыванне Варшавы. Гэта ўжо занадта. Смешныя падставы для затрымання ў паказваюць, што рэжым не звяртае ўвагі на папярэджанні Варшавы. Якая карысць ад гутаркі міністра Сікорскага з кіраўніком МЗС Беларусі Мартынавым? Што яшчэ павінны зрабіць з палякамі беларускія ўлады, каб Польшча адрэагавала больш востра, а Еўропа падтрымала? Чаму маўчыць кіраўнік МЗС Еўрасаюза баранеса Эштан? Ці яна таксама лічыць, што праблема палякаў у Беларусі з'яўляецца прыватнай справай Мінска? Міністр Сікорскі, час сказаць: «Хопіць!» Таму што праз хвіліну можа быць позна.

**«Gazeta Wyborcza» (Польшча)**

Узнікае пытанне: ці варта наогул весці перамовы з прадстаўнікамі беларускага рэжыму? Ці было мэтазгодным рашэнне пра змякчэнне некаторых санкцый у адносінах да Беларусі і дазвол беларускім vip-персонам, у тым ліку і Лукашэнку, зноў беспераашкодна падарожнічаць па Еўропе? Гэта можа прагучаць як прызнанне сваёй бездапаможнасці. Гавораць, што галоўнае — не пакідаць Беларусь у зоне ўплыву Расіі. Каб садзейнічаць умацаванню яе суверэнітэту прапануючы Мінску аднача́сова перспектыву збліжэння з Захадам. І гэты падыход працягвае заставацца актуальным. Хоць гэта задача не з лёгкіх, у чым нас пераканаў у Варшаве міністр Мартынаў. Наведаўшы Варшаву праз некалькі дзён пасля таго, як беларускай міліцыяй і судамі былі ўжыты рэпрэсіі супраць польскай нацыянальнай меншасці, і кажучы, што нічога асаблівага не адбылося, беларускі дыпламат пасмяяўся з Польшчы, Еўрапейскага саюза, а таксама з сістэмы каштоўнасцяў, якая імі прызнаецца.

**«Rzeczpospolita» (Польшча)**

Найбольш надзейнымі партнёрамі Расіі па-ранейшаму з'яўляюцца Казахстан, Таджыкістан і Арменія. У гэты спіс уваходзіла таксама Беларусь, з якой Расія планавала стварыць Саюзную дзяржаву, але высакамернасць расійскіх кіраўнікоў вычарпала трыванне Лукашэнкі, «апошняга дыктатара Еўропы», — такую характарыстыку даў яму былы прэзідэнт ЗША Джордж Буш. Апошні эпізод напружанасці ў адносінах паміж Масквой і Мінскам выклікалі падвышэннем мытаў на нафту. Расіі давялося саступіць з прычыны пагрозы Беларусі перакрыць пастаўкі нафты па сваіх трубаправодах у Еўропу.

**«El Correo» (Іспанія)**

Віктар Януковіч у люстэрку беларускай улады малюецца пакуль не занадта прывабна: падобна, ён стварае ёй больш праблем, чым адкрывае перспектыў. Якія пункты найбольш крытычныя для цяперашняга афіцыйнага Мінска ў «плане Януковіча»? Па-першае, новы прэзідэнт Украіны прапануе адмовіцца ад сепаратнай «энергетычнай хартыі», якую падпісалі Цімашэнка і прадстаўнікі ЕС у «абыход Расіі», і якая аддае ў маёмасць еўрапейцам усю газатранспартную сістэму Украіны. Януковіч мае намер гуляць не на супярэчнасцях паміж Масквой і Брусэлем, а зусім наадварот. І, у адрозненне ад Мінска, больш не жадае выбудоўваць «асобную ад Расіі» газатранспартную сетку Еўропы, з нейкімі «альтэрнатыўнымі» пастаўшчыкамі паліва. Такім чынам, генеральная ідэя «Усходняга партнёрства» — палітычна аб'яднаць спажыўцоў і транзіцёраў супраць галоўнага пастаўшчыка — пазбаўляецца хоць нейкага, хай самага эфемернага, эканамічнага абгрунтавання.

**Regnum.ru (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### РАСІЯ. НОВЫ ВОБРАЗ РАСІЙСКАГА ВОЙСКА

Далёка не аднaзначную рэакцыю выклікала ўступленне ў сілу ўказа Дзмітрыя Мядзведзева аб фармаванні ў рамках расійскага войска спецыяльнай часткі казакоў. Лічыцца, што менавіта сюды будуць накіроўваць моладзь з раёнаў, дзе захаваліся казацкія традыцыі (Растоўская вобласць, Кубань і г. д.). Галоўны сэнс ініцыятывы, па словах прадстаўніка Мінабароны, — «захаванне традыцый і стварэння новага вобразу арміі». Аднак не ўсё так проста. Спецыялісты заклікаюць Крэмль як мага хутчэй адмовіцца ад гэтай ідэі. Па-першае, вяртанне да традыцый азначае стварэнне новага асобнага вайсковага статусу выключна для гэтага фармавання. Казакі не ведалі такіх чыноў, як, напрыклад, яфрэйтар. Затое ў іх былі харунжы, атаман і г. д. Па-другое, дывізія з казакоў — не што іншае, як нацыянальнае фармаванне (шмат казакоў адмаўляюцца лічыць сябе расіянамі). Ці не дасць фармаванне дывізіі падставу іншым этнасам РФ патрабаваць стварэння сваіх нацыянальных вайсковых частак?

**Па матэрыялах расійскай прэсы**

### ВЕНЕСУЭЛА. НЕ ЛЮБІШ КУБУ – ІДЗІ Ў АДСТАЎКУ

Міністр аховы здароўя Венесуэлы цяпер шукае сабе новую працу. Уга Чавес падпісаў указ пра яго адстаўку. Афіцыйна пра прычыны адстаўкі не інфармуюць. Аднак незалежная прэса сцвярджае, што міністра выставілі на вуліцу з-за яго нелюбві да кубінцаў. Як вядома, Каракас імпартуе медыкаў з Кубы. Тыя працуюць за меншую плату, аднак свае функцыі выконваюць вельмі добра. Куба — рэгіянальны лідэр у галіне падрыхтоўкі медычных кадраў. Акрамя таго, кубінскія дактары самі не супраць папрацаваць за больш-менш прыстойныя грошы (заробак на Кубе каля 20 долараў). Аднак, калі верыць прэсе, кубінцы не абмяжоўваліся папросту аказаннем медычных паслуг. Яны пачалі, апіраючыся на Чавеса, ціхі захоп Міністэрства аховы здароўя. Пратэст супраць такой кубінскай акупацыі, кажуць, і каштаваў міністру пасады. Дарэчы, за 11 гадоў праўлення Чавеса на 27 міністэрскіх пасадах пабывалі 157 чыноўнікаў.

**Па матэрыялах «El Universal» (Венесуэла)**

### УКРАІНА. 80 ГАДОЎ ЛІКВІДАЦЫІ АЎТАКЕФАЛЬНАЙ ЦАРКВЫ

Грамадскасць Украіны адзначыла 80-ю гадавіну ліквідацыі бальшавікамі Украінскай аўтакефальнай праваслаўнай царквы (УАПЦ). УАПЦ нарадзілася ў 1917 годзе, калі ва Украіне назіраўся каласальны выбух нацыянальнай самасвядомасці. Не засталася ў баку ад працэсу ўкраінізацыі і царква. У другой палове 1917 года была створаная Усеўкраінская царкоўная рада, якая занялася перакладам на ўкраінскую мову царкоўнай літаратуры, адукацыяй святароў і адначасова наладзіла кантакты з Канстанцінопалем наконт магчымасці стварэння незалежнай украінскай памеснай царквы. У 1920 годзе такая царква была абвешчана. На гэты момант УАПЦ мела больш за 500 прыходаў. У сярэдзіне 1920-х замест заснавальніка УАПЦ Васіля Ліпкіўскага на пасаду архіепіскапа быў абраны кандыдат ад улады, які пачаў паступовую падрыхтоўку да ліквідацыі УАПЦ. Сама ліквідацыя — натуральна, па просьбах працоўных, — адбылася ў рамках спецыяльнага сабору УАПЦ у пачатку 1930 года. Яе парафіі перайшлі ў склад РПЦ. Пасля гэтага амаль усе святары УАПЦ былі арыштаваныя і адправіліся ў Сібір.

**Па матэрыялах «День» (Украіна)**

### АРГЕНЦІНА. НОВАЯ ВАЙНА ЗА МАЛЬВІНЫ

Афіцыйны Буэнас-Айрэс рэзка раскрытыкаваў намер брытанскага ўраду пачаць здабычу нафты на поўначы архіпелагу Мальвіны (брытанская версія назвы Фальклендскія астравоў). Мальвіны (Фальклены) — калонія Вялікабрытаніі, хаця Аргенціна лічыць іх часткай сваёй тэрыторы. Спрэчка прывяла да сапраўднай вайны ў пачатку 1980-х. Аргенціна прайграла, што, дарэчы, спрыяла падзенню тагачаснай вайсковай дыктатуры. Аднак праблема Мальвінаў засталася. Аргенціна ўважліва сочыць за тым, што адбываецца на астравах. І, натуральна, МЗС краіны не прайшоў міма рашэння пачаць здабычу карысных выкапняў. У Лондан ужо адбілі ноту пратэсту супраць «эксплуатацыі нашых рэсурсаў», звярнуліся са скаргай у ААН. Адначасова праз моцную італьянскую дыяспару ў Аргенціне Буэнас-Айрэс спрабуе ціснуць на Рым, каб той таксама асудзіў палітку Аб'яднанага Каралеўства. Лондан пакуль маўчыць. Між тым, спецыялісты кажуць, што, хутчэй за ўсё, у рамках адказу брытанцы адмовяцца ад вываду сваёй васковай базы на астравах (планавалася зрабіць перавод у гэтым годзе).

**Па матэрыялах «El Publico» (Іспанія)**

### МАЛДОВА. ГАГАУЗЫ ПАТРАБУЮЦЬ ФЕДЭРАЦЫІ

Народныя сходы Гагаузіі — аўтаномнага раёна на поўдні Малдовы, дзе пражываюць гагаузы (малдаване цюркскага паходжання), прынялі спецыяльную заяву, прысвечаную палітычнаму крызісу ў краіне. Зараз большасць у парламенце Малдовы — дэпутаты ад праеўрапейскіх і прарумынскіх партый, аднак у іх не хапае галасоў, каб абраць прэзідэнта. Адначасова дэмакратычны ўрад праводзіць курс на кааперацыю з Бухарэстам. Апазіцыя ў асобе камуністаў баіцца, што справа ідзе пра паступовую інкарпарацыю краіны Румыніяй. Да лагеру праціўнікаў ураду і ідэі інтэграцыі з Румыніяй адносяць сябе і цяперашняе кіраўніцтва Гагаузіі. Гагаузы прапануюць абвясціць Малдову федэрацыяй, у якой будуць тры суб'екты — Малдова, Прыднястроўе і Гагаузія. Адначасова гагаузы патрабавалі надаць рускай мове статус дзяржаўнай.

**Па матэрыялах «Новай газеты» (Малдова)**

СПОРТ

# АЛІМПІЯДЫ І СКАНДАЛЫ

*Алег ПЯТРОЎ*



**Звычайна, алімпіяды — гэта яшчэ і гучныя скандалы, якія, як правіла, звязаныя з допінгам або карупцыяй. Аднак у гісторыі алімпійскага руху хапала скандалаў і на іншай глебе. Вось далёка не поўны спіс.**

**1912 год, Стакгольм.** Амерыканскі атлет Джым Торп быў пазбаўлены залатога медаля за тое, што, як стала вядома, гуляў у прафесійнай лізе. У знак салідарнасці з Джымам срэбраны прызёр адмовіўся ад медаля. Гісторыя з медалямі на гэтым не закончылася: у 1983 годзе Міжнародны алімпійскі камітэт усё ж такі вырашыў аддаць Джыму ягоны медаль. Праўда, сам спартсмен памёр за тры гады да гэтага. Медаль аддалі ягоным дзецям.

**1932 год, Лос-Анжэлес.** Шведская дэлегацыя даведалася, што Паава Нурмі, фінскі бягун, які 9 разоў перамагаў на алімпіядах, займаецца прафесійным спортам. Шведы паспяшаліся падзяліцца навіной з арганізатарамі алімпіяды, і тыя забаранілі Паава бегчы марафон. Інцыдэнт меў наступствы. Аж да 1939 года фіны адмаўляліся праводзіць традыцыйнае штогадовае шведска-фінскае атлетычнае спаборніцтва.

**1936 год, Берлін.** У барацьбе за медалі сярод веласіпедыстаў у фінале немец Тоні Меркенс збіў галандскага веласіпедыста і прыйшоў першым. Нягледзячы на скандал, Тоні пазбег дыскваліфікацыі. Больш таго, нямецкія ўлады за тую перамогу ўзнагародзілі яго ста рэйхсмаркамі.

**1956 год, Мельбурн.** Матч па воднаму пола паміж камандамі СССР і Венгрыі ўвайшоў у гісторыю як матч на крыві. Гульня адбывалася літаральна пасля падаўлення СССР Венгерскай рэвалюцыі. Венгерская зборная, якая трэніравалася пад Будапештам, была вывезена ў Чэхаславакію, а адтуль — у Аўстралію. Толькі там венгры даведаліся пра падзеі на радзіме. Яны вырашылі адпомсціць акупантам у спорце. Напярэдадні нават вывучылі брудныя фразы па-руску, каб раздражніць праціўнікаў. Па ходу гульні ўвесь час адбываліся сутычкі. Самая буйная мела месца амаль перад фінальным свістком. Савецкі спартсмен так моцна ўдарыў венгра, што ў яго пацякла кроў. Выгляд таго венгра выклікаў эмацыйны выбух сярод балельшчыкаў, якія і так былі настроеныя антысавецкі. Фанаты Венгрыі пачалі скакаць у ваду і біць савецкіх спартсменаў. За імі была вымушана скакаць паліцыя. Сам матч скончыўся перамогай венграў 4–0. Як толькі алімпіяда завяршылася, палова з тых венгерскіх спартсменаў папрасіла палітычнага прытулку.

**1968 год, Мехіка.** Амерыканскія чарнаскурыя атлеты Томі Сміт і Джон Карлас падчас уручэння ім медалёў працягнулі руку наперад. Гэты жэст быў вядомы ў ЗША як салют «Black Power». Так салютавалі адзін аднаму актывісты антыўрадавага левацкага руху «Чорныя пантэры».

**1972 год, Мюнхен.** Усе ведаюць пра трагічныя падзеі мюнхенскай алімпіяды, калі група арабскіх тэрарыстаў захапіла ізраільскіх атлетаў. 11 з іх у выніку былі забітыя. Другім самым вялікім скандалам Мюнхена стаў баскетбольны матч ЗША — СССР. З-за таго, што гадзіннік, які фіксаваў час, напрыканцы чамусьці прыпыніўся, было вырашана перайграць апошнія пару секунд гульні. На гэты час амерыканцы вялі 50–49. За апошнія пару секунд савецкі баскетбаліст змог закінуць мяч у кошык. Так СССР стаў чэмпіёнам. Амерыканскія спартсмены ў сваю чаргу адмовіліся ад срэбраных медалёў. Дасюль баскетбольная федэрацыя ЗША лічыць, што ў 1972 годзе менавіта іх спартсмены сталі алімпійскімі чэмпіёнамі.

**1972 год, Сапара.** Аўстрыйскі лыжнік Карл Шранц быў дыскваліфікаваны за тое, што, быццам, зарабляў грошы як прафесійны спартсмен, рэкламуючы кампанію Kneissl. Доказам пры гэтым было асабістае сяброўства лыжніка з дырэктарам кампаніі і здымак, на якім ён гуляе ў футбол у майцы з надпісам Kneissl. Абураны спартсмен заявіў, што стаў ахвярай дыскрымінацыі, і дазволіў сабе крытыку на адрас тагачаснага дырэктара МАК. Выпадак прымусіў МАК перагледзець крытэрыі спонсарства, а дырэктар МАК сышоў у адстаўку.

**1976 год, Манрэаль.** Пратэстуючы супраць туру зборнай Новай Зеландыі па Паўднёвай Афрыцы (там панаваў апартэід), 22 афрыканскія краіны патрабавалі ад МАК забараніць удзел дэлегацыі Новай Зеландыі ў Алімпіядзе. МАК адмовіўся. Тады афрыканцы абвясцілі Гульням байкот.

**1980 год, Масква.** Акрамя байкоту Гульняў шэрагам заходніх краінаў, Алімпіяда запомнілася ўчынкам польскага скакуна з шастом Уладзіслава Казакевіча. У фінале яму супрацьстаяў савецкі спартсмен, якога горача падтрымлівалі ўсе Лужнікі. Казакевіч пасля таго, як пераскочыў планку (гэта быў пераможны скачок), у прыліве эмоцый пасля прызямлення паказаў непрыстойны знак балельшчыкам. Савецкая дэлегацыя патрабавала адабраць у паляка медаль, аднак у выніку Казакевічу яго пакінулі. Дарэчы, гэты жэст Казакевіча ўвайшоў у спіс самых вядомых жэстаў, якія рабілі палякі ў гісторыі.

**2004 год, Афіны.** Мелі месца 27 выпадкаў, калі спартсмены былі злоўленыя на ўжыванні допінгу. Пакуль гэта рэкорд у гісторыі алімпійскага руху. Запомніўся таксама кур'ёзны выпадак у валейбалістаў. Падчас валейбольнага матчу ЗША — Грэцыя з трыбуны пачуўся чыйсьці свіст. Грэкі вырашылі, што суддзя прыпыніў гульню, і спыніліся на пляцоўцы. Карыстаючыся гэтым, амерыканцы, што працягвалі гуляць, узялі ачко, якое ў выніку зрабіла іх пераможцамі. Грэкі спрабавалі апратэставаць матч, аднак дарэмна.




**2008 год, Пекін.** Скандалы пачаліся задоўга да Гульняў. Так, іспанскія мужчынская і жаночая зборныя па баскетболу зняліся для аднаго выдання. На здымках яны прыплюшчвалі вочы такім чынам, каб яны сталі падобныя на вочы азіяцкіх народаў. Кітайскія ўлады зразумелі гэту міміку як знявагу іх расы.

МЕРКАВАННІ

# НАШТО КАЗАХУ МЫТНЫ САЮЗ?

Алег НОВІКАЎ

**Да гэтага часу беларусы не разумеюць, навошта ім спатрэбіўся створаны ў снежні Мытны саюз з Расіяй і Казахстанам. Тое ж пытанне здаецца, задаюць і казахі. Прапануем агляд казахскай прэсы і інтэрнэт-форумаў на тэму мытнай інтэграцыі.**




«Краіна займее выгады з павелічэння аб'ёмаў гандлю, атрымае паляпшэнне інвестыцыйнага клімату і іншыя перавагі, якія павінны з'явіцца, па запэўніваннях, у выніку свабоднага руху працоўнай сілы і капіталу ў межах дзяржаў мытнага аб'яднання», — адзначае «Казахстанская праўда», блізкая да адміністрацыі Назарбаева.

Аднак шэраг незалежных аналітыкаў не падзяляюць аптымізму каманды прэзідэнта адносна таго, што Казахстан можа атрымаць эканамічную карысць ад сяброўства ў МС. Іх галоўны тэзіс: ліквідацыя мытных бар'ераў можа прывесці да насычэння мясцовага рынку імпартнымі таварамі і падарваць пазіцыі айчынных вытворцаў. Таксама вынікам гэтага можа стаць узмацненне інфляцыі.

Аналітык Дасым Сатпаеў у газеце «Казахстан сегодня» адзначае: «Вялікія прыродныя рэсурсы Расіі і яе параўнальна добра развітая прамысловасць і канкурэнтаздольныя прадукты, верагодна, атрымаюць перавагу на рынку Казахстана за наступныя тры ці чатыры гады».

Ён таксама заўважае, што казахскія прадукты сельскай гаспадаркі і малочныя вырабы адстаюць па якасці, дызайну і маркетынгавых параметрах ад аналагічных прадуктаў вытворцаў з Расіі і Беларусі.

Папулярная ідэя пра тое, што Мытны саюз стаў своеасаблівым выратавальным кругам для крызіснай казахскай эканомікі: «Думаю, што МС патрэбны Казахстану, паколькі за гэтыя 20 гадоў Казахстан моцна сеў на «сыравінную іголку» як у прамысловых, так і ў сельскагаспадарчых адносінах. Летась у сваім пасланні Назарбаеў казаў, што звыш 50–60 працэнтаў усіх харчовых і іншых тавараў завозіцца з-за мяжы. Таму выгодней у эканамічным, коштавым плане вялікую частку гэтых тавараў закупляць у Расіі і ў Беларусі, чым везці з іншых краін і кантынентаў», — піша на інтэрнэт-форуме zona-kz нехта Сербандзінаў.

Аднак такія сербандзінавы ў відавочнай меншасці. Паколькі Казахстан не гатовы да роўнай эканамічнай інтэграцыі, аналітыкі схіляюцца да думкі, што рашэнне пра ўступленне ў МС было палітычным актам. Аднак з якой мэтай? На гэта пытанне ёсць шмат адказаў.

Па словах эксперта Эдуарда Палетаева, «частка яго (Назарбаева) стратэгіі заключалася ў гарантаванні таго, каб шматлікая этнічная супольнасць рускіх, якія кампактна пражываюць на поўначы краіны, адчувала, што ў іх ёсць будучыня ў незалежнай дзяржаве Казахстан». Палетаеў блізкі да думкі тых, хто лічыць, што Назарбаеву патрэбны МС, каб вырашыць інжынерны голад.

«…Казахі паспяхова сталі нацыяй гандляроў — за гэтыя суверэнныя гады тое ведае кожны. З іншага боку, жадаем мы гэтага ці не жадаем, падабаецца нам ці не, трэба прызнаць, што ў савецкія гады ўсе заводы, фабрыкі і іншыя прадпрыемствы, якія былі ў Казахскай ССР, працавалі за кошт высокакваліфікаваных кадраў з Расіі, Украіны. Ніколі казахі не складалі большасці ў гэтай катэгорыі. І нават тады, галоўным чынам, казахі імкнуліся атрымліваць не тэхнічную адукацыю і спецыяльнасці. А з 1991 года ў большасці сваёй нашы студэнты набываюць эканамічную і юрыдычную адукацыю. Спытай кожнага — ва ўсіх адна мара: стаць кіраўніком» (Асад).

Другая катэгорыя экспертаў і каментатараў лічыць, што Назарбаеў заключыўшы Мытны саюз, хацеў падтрымаць свой імідж інтэгратара СНД (менавіта так яго называе казахскі афіцыёз).

«Назарбаеў лічыць сябе бацькам інтэграцыйных працэсаў у межах СНД, і ён разглядае Мытны саюз вынікам уласных высілкаў, як сваё стварэнне», — падкрэслівае казахская служба «Радыё Свабода».

Нарэшце, існуе і трэцяя думка: Назарбаеў прадаўся Маскве. «Эйша таймс анлайн» у рэдакцыйным артыкуле адзначае: «У Масквы цалкам можа быць геапалітычная цікавасць у больш цесным уключэнні ў арбіту ўласнага ўплыву і дамінаванні найбольш багатай і самай паспяховай эканомікі Цэнтральнай Азіі — іншымі словамі, Казахстана».

На форумах можна сустрэць меркаванне, што для Масквы ідэя прывязкі Казахстана стаіць на другім месцы. Зараз галоўнае для расіян — не пусціць у рэгіён Кітай.

«Мытны саюз Расіі не выгадны, бо, напрыклад, НДС там 18% супраць 12% у Казахстане. Гэта азначае, што пры аднолькавым сабекошце тавар з Казахстана будзе танней. Ёсць і шэраг іншых фактараў, з-за якіх кіраўніцтва мытнай службы РФ прагназуе страту прыбыткаў бюджэту 378 мільярдаў рублёў штогод. Хоць яны, магчыма, плануюць пакрыць гэтыя выдаткі за кошт продажу сваіх аўтамабіляў. Тым не менш, стварэнне МС — гэта хутчэй палітычнае рашэнне, чым эканамічнае. Як наш адказ кітайскай экспансіі» (Хамза).

Цікава, што шматлікія наведвальнікі інтэрнэт-форумаў крытыкуюць Назарбаева за тое, што ён аддаў перавагу Маскве, а не Пекіну.

«Ідэя МС можа быць перспектыўнай, калі ў яго ўключыць, напрыклад, такога рэгіянальнага гіганта, як Кітай. Кітай лепш за любую іншую краіну можа правадзіць мудрую палітыку і ісці на кампрамісныя ўмовы. Трэба ўмець з ім супрацоўнічаць», — дзеліцца рэцэптам нехта Аліеў.

На форумах хапае версій наконт таго, што Назарбаеў заключыў гэты саюз, паколькі ён марыянетка Крамля. Вось іхні аналіз: «Я думаю, наш паважаны прэзідэнт настальгуе па СССР. Ён з пакалення СССР. І вось савецкі вектар, але трэба мець на ўвазе: у Расіі ёсць так званыя ва ўсім свеце «імперскія амбіцыі»! Не дай Алах нам зноў стаць калоніяй Расіі!»

У казахаў з радыкальнымі нацыяналістычнымі поглядамі свая альтэрнатыва Мытнаму саюзу: «Трэба аб'ядноўвацца ў «Цюркскі саюз»! Вось перспектыва для Казахстана! А Расія ёсць Расія, пакуль рускія не перастануць лічыць сябе «дзяржавай» ці «вышэйшай расай» з імі ніхто не будзе весці канструктыўны дыялог!»

Як бачым, казахскае грамадства таксама не вельмі разумее сутнасць Мытнага саюза і хутчэй не давярае праекту, разглядаючы яго як змову палітычных элітаў Масквы і Астаны, прычым з карысным мэтамі.

Застаецца дадаць наконт іміджу Беларусі ў казахскай дыскусіі наконт МС. Як правіла, казахі думаюць, што наша сяброўства — гэта нейкі хітры выбрык Лукашэнкі. «Бацька — прамы чалавек, калі яго краіне ад МС стане горш, то ён проста плюне на такі саюз», — кажа адзін з казахскіх юзераў.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ГІДА ВЕСТЭРВЕЛЕ



Старшыня Свабоднай дэмакратычнай партыі (FDP) калісьці дабіўся амаль неверагоднага. Увосень стаў сенсацыяй поспех FDP на выбарах у Бундэстаг — партыя атрымала 14 працэнтаў (гістарычны рэкорд), што дазволіла скласці кааліцыю з хрысціянскімі дэмакратамі Ангелы Меркель. Аднак хутка паміж партнёрамі ўзніклі праблемы, і ўвогуле пазіцыя лібералаў (перш за ўсё, ідэя скасавання сістэмы прагрэсіўных падаткаў) выклікала рэзкае падзенне рэйтынгу партыі. Праз сто дзён існавання кабінета кансерватараў і лібералаў давер да яго сярод немцаў складае прыкладна 35 працэнтаў. Яшчэ горшая сітуацыя ў FDP. Папулярнасць партыі ўпала да сямі працэнтаў. Адначасова вырасла падтрымка Зялёных, якія ўвесь час робяць канкурэнцыю лібералам у барацьбе за трэцяе месца ў нямецкай палітыцы. Цяпер менавіта Зялёныя моцна трымаюць бронзу (у іх 17 працэнтаў папулярнасці). Зараз справы ў партыі лібералаў настолькі дрэнныя, што на мінулым тыдні ўпершыню некаторыя функцыянеры FDP сталі казаць пра магчымую адстаўку Вестэрвеле з пасады старшыні.

### АЛЕГ ЦЯГНІБОК



Лідэр праварадыкальнага ўкраінскага аб'яднання «Свабода», здавалася, прайграў мінулыя прэзідэнцкія выбары. Аднак цяпер высвятляецца, што нацыяналісты зрабілі сапраўдны прарыў. Раней «Свабода» збірала свае галасы выключна за кошт трох абласцей Заходняй Украіны (тут за яе галасавалі 71 працэнт выбарцаў, а на правым беразе Дняпра — толькі 20). Цяпер колькасць прыхільнікаў «Свабоды» на Захадзе і Усходзе прыкладна роўная: 55 працэнтаў — Захад і 45 працэнтаў — Усход. У такіх буйных гарадах, як Херсон і Харкаў, былы стаматолаг (прафесія Цягнібока) набраў у пяць-дзесяць разоў больш, чым пяць гадоў таму. Акрамя таго, стала вядома, што амерыканскі часопіс «Foreign Policy» прызнаў «Свабоду» адной з пяці самых дынамічных партый свету. Каментуючы поспехі, Цягнібок кажа, што яго фармацыя ў хуткім часе кардынальна зменіць партыйныя схемы. Ёсць, аднак, і шмат скептыкаў адносна амбіцый Цягнібока. Апошнім часам культавай фігурай украінскіх нацыяналістаў, дзякуючы прызнанню Сцяпана Бандэры героем Украіны, стаў Віктар Ючшанка.

### ДАМІНІК ДУКА



67-гадовы сябра дамініканскага ордэну Дамінік Дука абраны кіраўніком каталіцкай царквы Чэхіі. Фігура новага архіепіскапа Пражскага вельмі цікавая. У маладосці ён быў актывістам так званага падпольнага касцёла. У часы камуністаў прасядзеў паўтара гады за кратамі за правядзенне нелегальнай імшы. Прычым яго суседам па камеры быў Вацлаў Гавэл — будучы прэзідэнт краіны, а тады дысідэнт і літаратар. Пасля вызвалення Дамінік Дука 15 гадоў працаваў на фабрыцы рабочым і адначасова працягваў тайна служыць у структурах каталіцкай царквы. Перамога Дукі выклікала вялікую дыскусію наконт лёсу касцёла ў Чэхіі. Дука лічыцца прыхільнікам паступовай мадэрнізацыі. Тое, што Бенедыкт XVI зрабіў выбар на карысць менавіта Дукі, выклікала вялікую радасць у асяроддзі былых дысідэнтаў. Вацлаў Гавэл спецыяльным лістом падзякаваў Рымскаму Папе за такое рашэнне.

НОВАЯ ГЕНЕРАЦЫЯ

# JAZZ-ВІТАННЕ З РАДЗІМАЙ

Другую частку цыкла «Новая генерацыя / Герой новага часу» адкрывае літаратурны партрэт Дар'і Ліс (нарадзілася ў 1981 годзе) — журналісткі і пісьменніцы з Залесся (Смаргоншчына), аўтаркі кнігі вершаў і прозы «Вясновы jazz» (серыя «Гарадзенская бібліятэка», 2008)

Марыя МАРТЫСЕВІЧ

**Цягнік «Магілёў — Вільня» стаіць у Залессі дзве хвіліны. Гэтага часу дастаткова, каб некалькі пасажыраў паспелі саскочыць на платформу з высокай падножкі вагона. Усе дзве гадзіны язды ў перапоўненым «літоўцы», як называюць віленскі цягнік мясцовыя жыхары, я мару, каб у гэтым кірунку хадзілі хуткасныя электрычкі з маленькім інтэрвалам, каб яны спыняліся ў маім квартале, і каб створаная ў 1794 годзе на, скажам так, станцыі майго прыбыцця мелодыя «Развітанне з Радзімай» аднойчы ператварылася з гімну змагароў за свабоду ў джынгл, які абвяшчае гэту станцыю. І калі я іду па завеяным Залессі паўз прадуктовы шапік «Паланез» у пошуках дома Дар'і Ліс, я яшчэ не ведаю: тое, што адбудзецца сёння ў маім унутраным свеце, — гэта яшчэ выразнейшае кшталтаванне утапічнай мары пра еўрапейскую Беларусь.**



У 2009 годзе на ўліку ў нашай краіне стаяла 507 тысяч — больш за паўмільёна — інвалідаў. Напачатку 2010 года незалежныя аналітыкі з дэпрэсіўным абурэннем сустракалі першыя вынікі перапісу насельніцтва РБ. Простая арыфметыка сведчыла: за апошнія 10 гадоў з Беларусі выехала блізу паўмільёна грамадзян. У суме гэта — мінус мільён эмігрантаў. Толькі здаровыя пакідаюць беларускі соцыум па ўласнай ініцыятыве, а непаўнаспраўныя застаюцца па-за грамадствам не па сваёй волі.

Становішча беларускіх асобаў з абмежаванымі магчымасцямі па сваіх наступствах для эканомікі ды культуры мала чым адрозніваецца ад эміграцыі — і гастарбайтэры, і паралізаваныя хворыя сочаць за апошнімі навінамі з дапамогай тэлебачання ды інтэрнэту, мала ўплываючы на падзеі. Прыезд студэнта з Масквы (Берліна) у родны горад на Каляды (Вялікдзень) і спуск інваліда-вазочніка ў двор уласнага дома з мэтай удзелу ў сходзе жыхароў — з'явы аднаго сацыяльнага плану.

Я думаю, гэта адзін з галоўных у нас з Дашай пунктаў перасячэння. Яна не хоча пакідаць сваю Беларусь шляхам гэткай вось унутранай эміграцыі.

Аднойчы ў Берліне я трапіла ў джаз-клуб, прастора якога была ўмоўна падзеленая на дзве часткі. Адна называлася «зона слухання», другая — «зона шаптання». У размове пра Дашу Ліс я прапаную па чарзе мінуць абедзве зоны: мы спачатку паслухаем, а потым пашушукаемся.

## Listening zone

Даша Ліс не пярэчыць, калі яе называюць «інвалідам», хоць зазначае: людзі на вазках зазвычай супраць таго, каб іх так называлі. Тут найперш прафесійнае: журналістам уласціва ашчаджаць словы. Па-другое, Даша так часта гаворыць пра праблемы інвалідаў, што доўгія паліткарэктныя выразы робяцца нязручнымі. Вобраз аўтаркі, які паўстае на старонках кнігі «Вясновы jazz», — далікатна-лірычны, пяшчотны і дакліўы. Ёсць вялікая спакуса паддацца гэтаму аксамітнаму рамантызму і намаляваць імпрэсіяністычны візерунак нашай Дашы. Дый дэкарацыі прынадныя: унікальная сядзіба і парк Агінскіх, поруч з якімі Даша нарадзілася і жыве ўжо 28 гадоў.

Але «Вясновы jazz» прывабіў мне іншымі нотамі, якія таксама там прысутныя, хоць мала пераважаць. У гэтай кнізе — ясны і лаканічны сінтаксіс, з дапамогай якога аўтарка спакойна і ўзважана выкладае сваю жыццёвую пазіцыю сучаснай дзяўчыны перадавых поглядаў. Гэтая пазіцыя — быць незалежнай. У тым ліку — ад сваёй хваробы. «Я ўжо ведаю, які ён будзе. Я выбрала ў інтэрнэце. Лёгкі, ручны, мабільны, кампактны, а галоўнае — з электрапрывадам», — апісвае Даша вазок сваёй мары — гаранта гэтай незалежнасці.

«Інваліднасць не павінна вызначаць лёс чалавека. Толькі карэктаваць», — паўтарае Даша прыватна і публічна. Але, па маіх назіраннях, у Беларусі гэта «карэктура» нагадвае працу дасведчанага цэнзара: парэзаць як мага болей, але каб чытач нічога не заўважыў. Па словах Дашы, чалавек з абмежаванымі магчымасцямі прымае не толькі выклік уласнай хваробы, з якім урэшце неяк дае сабе рады, але і вылік знешніх абставінаў, што значна цяжэй. У біяграфіі Дашы Ліс прыцягвае ўвагу сумны кур'ёз: месца будучай адукацыі было прадвызначана… наяўнасцю ліфта ў будынку. У сталічных МДЛУ і філфаку БДУ гэткага дасягнення цывілізацыі няма, а ў шматпавярховым педуніверы імя Максіма Танка — ёсць. Так што выбар Дашы мела толькі між факультэтамі гэтай шаноўнай установы — і ў выніку скончыла завочна факультэт беларускай філалогіі і культуры.

Цягнік «Магілёў — Вільня» стаіць у Залессі дзве хвіліны. Гэтага часу дастаткова, каб паказаць правадніцы квіток і заскочыць на падножку вагона. Для таго, каб выканаць наступныя дзеянні: паказаць правадніцы некалькі квіткоў, залезці на падножку з чалавекам у руках, скласці вазок, занесці вазок у тамбур, — гэтага часу катастрафічна мала. Цалкам верагодна, давядзецца зрываць стоп-кран і плаціць штраф. Каб пасадзіць інваліда-вазочніка на цягнік БЧ, патрэбныя час і высілкі некалькіх дужых мужчынаў. Паколькі людзям з фізічнымі абмежаваннямі і так увесь час здаецца, што яны замінаюць гэтаму свету налева і направа, яны стараюцца не складаць яму залішніх праблем.

Дар'я Ліс любіць вандраваць, але робіць гэта выключна калі ў яе занятых працай бацькоў ёсць час вазіць яе на машыне. Пры гэтым — вось яна, загана вышэйшай адукацыі для «праблемных» індывідаў, — Даша ведае: існуюць сусветы, дзе лёгкім рухам рукі пасажыра падножка вагона ператвараецца ў пандус, які знаходзіцца на адным узроўні з перонам, а калідор у вагоне дастаткова шырокі для вазка любых габарытаў. Зрэшты, нядаўна да тэорыі дадаўся эмпірычны досвед: у снежні 2009 года Даша пабывала на літаратурным семінары «Бязмежжа» на Беласточчыне. Па яе словах, на польскім баку, дзякуючы арганізатарам і інфраструктуры, яна не адчувала ніякіх фізічных абмежаванняў нідзе — ані падчас паэтычных чытанняў у Белавежскай пушчы, ані падчас шопінгу ў гандлёвых цэнтрах Беластоку. На гэтым месцы мы «добрым словам» згадваем мінскі праспект Незалежнасці. Крамы гэтага праспекту знакамітыя тым, што на ганку маюць элегантны пандус, які за дзвярыма змяняецца крутымі сходамі ў сутарэнні.

Тым больш Даша імкнецца да незалежнасці, чым больш складаным ёсць для яе ажыццяўленне мэты з дыягназам «спінальная аміатрафія». Дзяўчыну трэба ўвесь час насіць на руках — і гэта не метафара, а жыццёвая патрэба. Галоўнымі сваімі героямі Даша называе сям'ю. Яе блізкае атачэнне — гэта яе бацькі, спадарыня Тамара (настаўніца рускай мовы) і спадар Алег (прадпрымальнік), малодшая сястра Аляксандра. Прыроджаная хвароба праявілася ў паўтара годзікі, а ў дванаццаць дзяўчына перастала хадзіць. Ні на хвіліну бацькі, а за імі і маленькая Даша, не перапынялі змагання: аб'ездзілі ўвесь былы Саюз па дактарах ды народных знахарах, а калі дазналіся пра невылечнасць, пастанавілі выхоўваць Дашу як звычайнага падлетка і — змагацца. Змаганне працягваецца і дагэтуль — гімнастычнай палкай, турнікам; сонцам і морам улетку, а ўзімку — смачнымі вітамінамі з гароду залесскай сядзібы.

Дом сям'і Ліс на ўскраіне Залесся — мікрамадэль сапраўды незалежнай Беларусі. Трапіўшы ў аб'ёмы гэтага дома, несупастаўныя з аб'ёмамі маёй гарадской кватэры, я пачулася адначасова Алісай у Цудасвеце і Гуліверам у краіне Ліліпутаў. Розніца была не толькі ў квадратных метрах, але і ў прапорцыях: дзвярныя праёмы і ўсе памяшканні тут — дастаткова шырокія для праезду і манеўравання Дашынага вазочка. «Сакрэт у тым, што гэта — сваё і рабілася для сябе», — кажа спадар Алег. Я і Даша, акурат па Чэхаве, проста сядзім на кухні і п'ем наш любімы напой — каву, і як бы нічога не адбываецца, але насамрэч адбываецца вельмі шмат. Мы размаўляем пра літаратуру, пра каханне, пра агульных працадаўцаў, расказваем пра сям'ю і сяброў… І ў тым, як узважана распавядае пра сваю хваробу і «карэктуру», якую тая ўносіць у яе ўнутраны свет, у яе «35 кілаграм аўфішачак і вар'яцінак», — разумееш: хвароба ў тым змаганні за незалежнасць, якое штодня працягваюць Даша і яе сям'я, целяпаецца ў хвасце турнірнай табліцы.

## Whispering zone

Я спрабую спрагназаваць рэакцыю на такі партрэт маёй гераіні. Некаторыя з вас абурацца, што, пішучы пра дзяўчыну ў вазку, я не дэманструю сваім стылем ані кроплі шкадавання. Але ж дадаць у голас шкадобы азначала б абрацъ неадпаведную фарбу. У біяграфіі Дар'і фігуруе такі пункт: працавала кансультантам у цэнтры псіхалагічнай падтрымкі. Я перакананая: з яе атрымаўся б выдатны «тэлефонны псіхолаг». Прычым не толькі для непаўнаспраўных жанчын, а для жанчын увогуле — як ні бязлітасна гэта прагучыць стасоўна ўсіх маіх дэпрэсіўных таварышак са здаровымі рукамі-нагамі (маю сумневы, што да галавы), кінутых або яшчэ не падабраных мужчынамі сваёй мары. Такі псіхолаг дае суразмоўцу «чароўнага выспятка» і навучае глядзець на рэчы канструктыўна. «Не толькі хворым патрэбны здароўя. Здаровым хворыя патрэбныя болей, каб лячыць свае зачарсцвелыя душы», — гэтыя словы паэткі Данута Бічэль з уступнага эсэ да кнігі «Вясновы jazz» вельмі дакладна апісваюць сутнасць стасункаў Дашы з людзьмі навокал.

Многія — і я ведаю, сябры, што вас большасць, — пацешацца, што я пазнаёмілася з сімпатычным вам чалавекам: у Дашы зайздросна шырокае кола сяброў, калег і знаёмых. Нехта з вас, безумоўна, жахнецца дыягназу — бедная дзяўчынка! — і папросіць за яе Бога падчас малітвы. Актыўныя асобы з добрым сэрцам, цалкам верагодна, наладзяць акцыю збору сродкаў на электравазок, так неабходны Дашы. І магчыма, знойдзецца шчодры спонсар, які прафінансуе дружнай і працавітай сям'і Ліс турпаездку ў Францыю — ва ўласнай прадмове да кнігі «Вясновы jazz» аўтарка дэкларуе сваю мару: «пабачыць Парыж (і жыць далей)»…

Толькі вось мэта Дашы — не разжаліць каго-кольвек, не раскруціць кагосьці на ажыццяўленне яе мараў, а давесці калегам і пацыенцыйным працадаўцам: яна здольна сама зарабіць на ўсё, пра што марыць. Жорсткая праўда: дзеці з цяжкімі спадчыннымі захворваннямі працягваюць нараджацца і расці, і лячыць іх хваробы на генетычным узроўні (трэба верыць, пакуль што) па-за магчымасцямі людзей планеты. Тое, што цалкам па плячы ўсім нам, — выхаваць сябе ў такое грамадства, дзе людзі з абмежаванымі магчымасцямі змогуць жыць і працаваць на роўных. Гісторыя Дашы Ліс, а таксама праблемы, якія дзяўчына ўзнімае ў публічнай прасторы, адкрываюць нам яшчэ адно еўрапейскае вымярэнне ідэальнай Беларусі: недасягальны свет, усе часткі якога звязаны зручнымі пандусамі і шырокімі калідорамі.

…Некалькі гадоў таму Даша вырашыла важнае для кожнага «рэчыста» пытанне: «Што збірацъ?» — і калекцыянуе званочкі. Рознакаляровая, рознакаліберная і рознагалосая калекцыя навісае над яе працоўным месцам — камп'ютарным сталом з вялізным маніторам і мініяцюрнай клавіятурай, даючы пра сябе ведаць ціхуткім дзынканнем, калі мы рухаемся па пакоі. І я нават не ведаю, што ёсць большай метафарай Дашы — яе магутны кампутар, дзе з маленькай клавіятуры ў свет выходзіць шырокае палатно разумнага тэксту — або такі вось маленькі кранальны званочак. Здаецца, і тое, і іншае цалкам падыходзіць. Такая вось чыста джазавая сінкопа.

СПАДЧЫНА

# АПОШНІ КАРОЛЬ

Кастусь ТАРАСАЎ

**Станіслаў Аўгуст Панятоўскі быў апошнім каралём Рэчы Паспалітай. Кацярына II дала яму карону, і яна ж яе забрала разам з каралеўствам. Ён ператварыўся ў нішто, у экзатычны экспанат Паўла I.**



Аўгуст Панятоўскі

## Элекцыя

Станіслаў Панятоўскі ніколі не стаў бы каралём Рэчы Паспалітай, калі б у трыццацігадовым узросце не здарыўся ў яго двухгадовы (1756–1758) бурлівы раман з Кацярынай, жонкай імператара Пятра III. У Панятоўскага не было ніякіх прычын нават прэтэндаваць на каралеўскі трон — ні волі, ні розуму, ні вышэйшых амбіцый. У лепшым выпадку, ён быў бы ў коле невядомых саноўнікаў, дзелячы свой час паміж картамі, музыкай, гутаркамі пра ўладу. Станіслаў Панятоўскі лічыўся сярод вяльможаў бязродным выскачкам.

Ён нарадзіўся ў 1732 годзе ў маёнтку Воўчын у Брэсцкім ваяводстве. Маці Станіслава паходзіла з князёў Чартарыйскіх, і гэта яна забяспечыла сыну падтрымку сваякоў. Але канцлер Міхал Чартарыйскі добра ведаў пляменніка і не меў на яго конт ілюзій.

Смерць Лізаветы ў 1762 годзе прывяла на трон Пятра III. Пры атрыманні Пятром дзяржаўнай улады дачыненні мужа і жонкі пачалі пагражаць Кацярыне небяспекай — разводам за шматлікія здрады і, паводле рускай традыцыі, зняволеннем у манастыры. Кацярына арганізавала змову гвардзейцаў, і браты Арловы сілай дамагліся ад Пятра III падпісання Акту адрачэння ад кароны. Праз восем дзён імператар быў задушаны, а маладая ўдава заняла трон.

У 1763 годзе смерць караля Рэчы Паспалітай Аўгуста III дала сігнал да барацьбы за карону. Адразу акцыі Станіслава Антонія Панятоўскага (пры каранаванні ён змяніў сваё імя на Станіслаў Аўгуст) узраслі настолькі, што канцлер Чартарыйскі і Кацярына II вырашылі змагацца за каралеўскае месца. У лісце паслу ў Варшаве Кацярына распараджаецца падтрымліваць кандыдатуру Панятоўскага, таму што «*он во время своего пребывания в Петербурге оказал своей родине больше услуг, чем кто-либо из министров Речи Посполитой*».

Са свайго боку канцлер Чартарыйскі арганізаваў у Беларусі канфедэрацыю шляхты ў падтрымку свайго пляменніка. На дапамогу канфедэратам увайшлі расійскія войскі. Адна калона ішла на Мінск, з іншай князь Дашкоў пайшоў да Варшавы для аховы Чартарыйскіх на сойме. Панятоўскі, прымаючы дапамогу Кацярыны II, ведаў, што яго чакае. Ён быў таемна азнаёмлены з яе ўмовамі. Вось асноўнае: «*Во все время своего государствования интересы нашей империи собственными почитать, их остерегать и им всеми силами по возможности поспешствовать*».



Кацярына II

У жніўні 1764 года сойм назваў Станіслава Аўгуста каралём. Адразу пасля элекцыі Панятоўскага сойм прызнаў імператарскі тытул Кацярыны, а Расію — імперыяй, ад чаго РП устрымлівалася паўстагоддзя, калі іншыя краіны гэта прызналі.

Расійская казна выдаткавала 4,4 мільёна рублёў на подкуп магнатаў. Гэтыя грошы трэба было адпрацаваць.

## Зарок бясшлюбнасці

Не ўступаючы ў шлюб сама, Кацярына II выставіла такую ж умову і для Панятоўскага. Але не з-за рэўнасці, а паводле палітычных меркаванняў. Заключэнне дынастычнага саюза паміж Польшчай і якой-небудзь моцнай дзяржавай магло разбурыць шматлікія палітычныя пабудовы, узведзеныя імператрыцай.

І апынулася, што двое былых умілаваных уладарылі як удава і ўдавец. У Станіслава Панятаўскага палюбоўніц было не менш за палюбоўнікаў у Кацярыны, але ролю фаварыткі выконвала адна — Эльжбета Грабоўская, якую кароль выдаў замуж за генерал-лейтэнанта, пратэстанта, маршалка слуцкай канфедэрацыі. Ад караля ў Эльжбеты былі дочкі Канстанцыя і Ізабела і трое сыноў — Міхал, Казімір, Станіслаў.

Грабоўскі памёр у 1789 годзе, і тады энергічная Эльжбета, якую да гэтага часу хвароба ператварыла з прыгажуні ў зласлівую гарбунню, дамаглася, каб Станіслаў Аўгуст склаў з ёй таемны шлюб. Праўда, сам кароль заўсёды адмаўляўся ад гэтага свайго ўчынку.

Тым не менш Эльжбета атрымала палац у Варшаве, 100 тысяч дукатаў і яшчэ штогадовы прыбытак з Гародні ў 1200 дукатаў. Гэта былі немалыя сумы. Напрыклад, гадавая аплата навучання дзяцей Грабоўскай у Рыме складала 250 дукатаў.

Літаральна з той хвіліны, як Станіслаў Аўгуст, прыняўшы таемныя ўмовы, стаў каралём, Кацярына II паслядоўна здзяйсняла тое, дзеля чаго дазволіла свайму былому палюбоўніку надзець карону. Першым такім дзеяннем стала патрабаванне да сойма зраўнаваць у правах дысідэнтаў (праваслаўных і пратэстантаў) з каталікамі, для чаго стараннямі Кацярыны ў 1767 годзе былі створаныя Слуцкая праваслаўная і Торуньская пратэстанцкая канфедэрацыі, узмоцненыя 40-тысячным расійскім войскам.

Панятоўскі выявіў наіўнасць, калі напісаў свайму прадстаўніку пры пецярбургскім двары: «*Последние приказания, данные Репнину, ввести диссидентов даже в законодательные учреждения как громом поразили как меня лично, так и страну*».

На гэта Кацярына II адказала лістом, у якім прасіла сваю каранаваную марыянетку не перашкаджаць Рапніну рабіць сваю справу. Панятоўскі, не верачы, што зняважаны да ролі нямога выканаўца, стаў настойваць і атрымаў апошняе папярэджанне: «Мне остается лишь предоставить это дело своей участи… я все сделала для вашего величества и для вашего народа, чтобы не упрекнули меня в том, что я искала в Польше случая применить силу своего оружия…»

## Фінал

У жніўні 1772 года была падпісана таемная Канвенцыя паміж Расіяй, Прусіяй і Аўстрыяй пра першы падзел Рэчы Паспалітай. У красавіку сойм у Гародні ратыфікаваў гэты падзел. Выконваючы таемныя абавязальніцтвы, Панятоўскі не прамовіў ні слова пратэсту. Ён быў як нямы пры галасаванні другога падзелу, як сляпы пры прызванні Таргавіцкай канфедэрацыі і г. д.

Падставай другога падзелу стала Канстытуцыя 3 мая 1791 года, мэта якой была цэнтралізаваць уладу ў Польшчы, што супала з рэвалюцыяй у Францыі. Панятоўскі галасаваў за прынцыпы Канстытуцыі, але хутка ад яе адмовіўся. Ён не ўзяў удзел у паўстанні, чаго патрабаваў ад яго каралеўскі гонар. Зрабіць другі падзел Польшчы і задушыць паўстанне пад кіраўніцтвам Касцюшкі Кацярына II змагла дзякуючы 22-тысячнаму рускаму войску, узначаленаму Аляксандрам Суворавым, што падышло да Варшавы, якую абаранялі 20 тысяч паўстанцаў.

Пасля захопу Варшавы, кароль пад наглядам князя Рапніна быў перамешчаны ў Гародню, дзе 25 лістапада ў каралеўскім замку падпісаў Акт адрачэння ад кароны. Рэч Паспалітая спыніла існаванне. Вяздзейнае існаванне ператварыла Станіслава Аўгуста ў ганебны знак зніклай дзяржавы. Панятоўскі жыў у Гародні да смерці Кацярыны II. Так яны і не сустрэліся на гэтым свеце. Магчыма, ёй не хацелася бачыць слабога чалавека, які не знайшоў у сабе мужнасці ўзначаліць войска і выйсці на поле бітвы, абараняючы асабісты гонар і гонар краіны.

**Літаральна з той хвіліны, як Станіслаў Аўгуст, прыняўшы таемныя ўмовы, стаў каралём, Кацярына II паслядоўна здзяйсняла тое, дзеля чаго дазволіла свайму былому палюбоўніку надзець карону**

Павел I загадаў прывезці Панятоўскага ў Пецярбург. Праз трыццаць пяць гадоў Панятоўскі зноў убачыў Неўскі праспект, Мармуровы палац, які прапанавалі яму заняць. Па іроніі лёсу, вязнем палаца быў Тадэвуш Касцюшка, толькі што вызвалены імператарам Паўлам з турмы.

Экс-кароль, які здаўся ў палон, волі не атрымаў. Павел абавязаў Панятоўскага ехаць пры ім у Маскву на каранаванне. Уезд Паўла быў прымеркаваны да Вербніцы. Па загадзе імператара ўся мужчынская частка світы была пасаджаная ў сядло. У гэтай кавалькадзе вершнікаў карчанеў ад марозу і 65-гадовы былы кароль Рэчы Паспалітай. Станіслаў Аўгуст апынуўся адзіным чужацкім каралём, якога правялі па Краснай плошчы як ваенную здабычу. На яго паказвалі пальцамі маскоўскія разявакі. Гэта была ганьба Панятоўскага, якую ён цярпліва знёс.

Імператар дазволіў экс-каралю трымаць асабістую гвардыю, павялічыў пенсію з 11 тысяч да 16,5 тысяч. Кароль мог прымаць каго заўгодна, мог маліцца ў касцёле святой Кацярыны, але не мог пакінуць Маскву. Ён ператварыўся ў яе экзатычны экспанат. Часам Станіслаў Аўгуст гэта ўсведамляў, і гаротны стогн «Божа мой! Божа мой!» суправаджаў яго жудасныя прасвятленні.

Станіслаў Аўгуст памёр ад апаплексічнага ўдару 12 лютага 1798 года. На пахаванне кампазітар Казлоўскі напісаў Requiem, які затым часта паўтараўся ў канцэртах. Станіслаў Аўгуст быў пахаваны ў Кацярынінскім касцёле, дзе труна яго, пастаўленая ў каменную нішу, датрымалася да 1938 года.

## На чужым месцы

Намерваючыся палепшыць адносіны з Польшчай, Сталін вырашыў у якасці добрага жэсту вярнуць палякам труну з целам апошняга караля. Рэшткі Станіслава Аўгуста былі вынятыя з нішы, старая труна змешчана ў новую, і цягнік даставіў яе на польска-беларускую мяжу, на станцыю Негарэлае. Аднак Сталін не ўлічыў, што ў Польшчы Станіслаў Аўгуст не карыстаўся павагай, за ім была слава здрадніка краіны. Везці труну караля ў Кракаў, у Вавельскі касцёл, дзе былі пахаваныя героі нацыі, не рашыліся і без пашаны змясцілі рэшткі ў касцёле святой Троіцы былога маёнтка Панятоўскіх у Воўчыне.

Так апошні кароль апынуўся на тым месцы, дзе яго некалі хрысцілі. Аб'яднанне Заходняй Беларусі з БССР, а затым вайна і атэістычнае разбурэнне святынь прывялі касцёл у запусценне. Толькі ў 1989 годзе беларускія адмыслоўцы паспрабавалі адшукаць у Воўчыне каралеўскія рэшткі. Але знайшлі толькі рэшткі дубовай труны, у якой яны былі пахаваныя. Тады ж у касцёле працавала экспедыцыя польскіх адмыслоўцаў, якія прасеялі ў крыпце ўсю зямлю. Гэта зямля разам з іншымі астаткамі змешчаная ў саркафаг, які ў 1995 годзе ўсталявалі ў Варшаве, у касцёле святога Яна, дзе Панятоўскі быў каранаваны.

Гадоў дзесяць таму Казімір Свёнтак, кардынал у Беларусі, у інтэрв'ю БТ паведаў, што да яго прыходзіў ліст ад вартаўніка воўчынскіх могілкаў. Той пісаў, што з пачаткам нямецкай акупацыі перанёс цела караля з крыпты на вясковыя могілкі і пахаваў яго пад чужым імем. Свёнтак вырашыў не ўмешвацца ў гэтую цёмную гісторыю. Вартаўнік ужо памёр, і магіла застаецца нераскрытай. Так і ляжыць зараз кароль Станіслаў Панятоўскі на могілках у Воўчыне. А дзе ляжыць — невядома.

▸ ВЕЧАРЫНА

# ВАЛЯНЦІНУ ТАРАСУ СПОЎНІЛАСЯ Б 80

Генадзь КЕСНЕР

**17 лютага ў літаратурным музеі Максіма Багдановіча, што ў Траецкім прадмесці Мінска, адбылася вечарына, прысвечаная 80-м угодкам вядомага беларускага паэта, пісьменніка, публіцыста, журналіста Валянціна Тараса.**

Ушанаваць памяць Валянціна Яфімавіча, які менш за год не дажыў да свайго юбілею, прыйшлі яго сябры, калегі па пісьменніцкім і журналісцкім цэху і людзі, што ведаюць творчасць гэтага цудоўнага літаратара.

Пачалася вечарына з дэманстрацыі невялічкага ўрыўка з фільма «Калі мяне не стане», сцэнар да якога напісаў сам Валянцін Тарас, ён жа і зняўся ў гэтай стужцы.

«Кожны з нас, нават у незалежнасці ад таго, веруючы ён альбо не веруючы, пражывае жыццё Хрыста. У кожнага сустракаецца ў жыцці свой Іуда, свой Пілат, свая Галгофа, свой Крыж. Крыж кожнага з нас — гэта наш абавязак перад жыццём, перад блізкімі, перад грамадствам, а самае галоўнае — перад самім сабой», — кажа з экрана Валянцін Тарас.

Дачка слыннага беларускага пісьменніка Алеся Адамовіча Наталля падчас апошняй сустрэчы сяброў яе бацькі, якая адбылася незадоўга да сыходу з жыцця Валянціна Тараса, запісала на аўдыёстужку адзін з яго апошніх вершаў. У гэтым творы згадваюцца сябры Валянціна, якія ўжо пайшлі з жыцця, — Навум Кіслік, Аляксандр Дракахруст, Васіль Быкаў… Завяршаецца верш такімі словамі:

*«Шуміць сяброў*
*маіх дуброва,*
*яна — не пустка,*
*не сталася залою шэрай.*
*Хто там спісаў мяне*
*на дровы?*
*Не маніць прымаўка:*
*сякерай не высекчы*
*жывыя словы».*

Пры канцы вечарыны адбылася прэзентацыя кнігі Віталя Тараса «Хроніка бягучых падзей», якую аўтар прысвяціў памяці свайго бацькі.

Як адзначаецца ў пасляслоўі да выдання, назву гэтай кнігі падказаў інфармацыйны бюлетэнь, які выходзіў у самвыдаце ў СССР. Рэаліі сённяшняй Беларусі шмат у чым нагадваюць савецкую практыку 1970-х — пачатку 1980-х гадоў мінулага стагоддзя. За адзіным выключэннем — у Беларусі вольнай ад цэнзуры зонай застаецца інтэрнэт. «Хроніку бягучых падзей» склалі выбраныя тэксты з блогу Віталя Тараса, якія апублікаваны цягам апошніх месяцаў на сайце БАЖ. Аўтар ставіць на мэце не толькі ўшанаваць памяць свайго бацькі Валянціна Тараса — партызана і літаратара, памяць яго сяброў, але спрабуе працягнуць іх лінію маральнага супраціву.

▸ ВЫСТАВА

# ТВОРЦА НОВАЙ БЕЛАРУСІ

Аляксей ХАДЫКА

**Лявон Баразна перайшоў у сферу легендаў. Мастак, які змагаўся за зберажэнне старога Мінска і разам з Зянонам Пазьняком надрукаваў у самыя застойныя часы, увесну 1969 года, артыкул «Заботясь о будущем» у яго абарону ў «Правде». Легендарны пачынальнік даследаванняў нацыянальнага сялянскага касцюму, які першым апрануў у блізкія да аўтэнтычных строі ансамблі народнай песні і танца розных куткоў Беларусі.**



Да 8 сакавіка ў Нацыянальным мастацкім музеі можна пазнаёміцца з выставай, што прадстаўляе каля 70 малюнкаў, пейзажаў, партрэтаў і знакамітых замалёвак народных строяў з прыватных збораў, калекцыі музеяў у Мінску і Талачыне.

Нават дата нараджэння мастака падаецца па-рознаму ў публікацыях апошніх гадоў, хаця на надмагільным помніку на радзіме час яго нядоўгага жыцця акрэслены дакладна: 3 снежня 1928 — 15 жніўня 1972. Апошнія лічбы пазначаюць дзень забойства мастака паблізу яго майстэрні на Камсамольскай, 15 (колішняй Феліцыянаўскай) у цэнтры сталіцы, у дні, калі Баразна рыхтаваў пратэст інтэлігенцыі супраць разбурэння старых кварталаў Нямігі. У выпадковасць смерці нязручнага ўладам творцы дагэтуль мала хто верыць.

У кнізе водгукаў на мемарыяльнай выставе, наладжанай яго сябрамі ў 1975 годзе, Уладзімір Караткевіч пакінуў запіс: «…Подзвіг, які зрабіў гэты чалавек у галіне вывучэння народнай вопраткі, — бязмерны, гэта… неацэнны скарб… для гісторыі».

Подзвіг Баразны — учынкі і здзяйсненні, на якія б наважыўся не кожны. У Талачыне, дзе паблізу ў Новым Сяле нарадзіўся Баразна, ён выканаў сваю першую жывапісную працу, якая адначасова была грамадзянскім актам. Разам з двума мастакамі з Расіі, што трапілі ў палон у часы нямецкай акупацыі, у 1942–1943 гадах, юнак без скончанай мастацкай адукацыі маляваў у адчыненай пасля савецкага атэістычнага руйнавання царкве абразы. Суайчыннікам была патрэбная вера, і ён падтрымліваў яе як мог. Ідэя ўмацавання годнасці, духу і веры ў сваім народзе вяла Баразну далей праз усё жыццё.



Ён верыў і адчуваў прыгажосць сваёй мовы — і першым выступаў на сходах у саюзе мастакоў па-беларуску, што выглядала ў тыя часы дэманстрацыяй грамадзянскай пазіцыі. Верыў у годнасць беларускай культуры і ўвасабляў сваю веру ў штодзённай дзейнасці. Замалёўкі традыцыйнага сялянскага касцюма Палесся, Гродзеншчыны, Міншчыны, Віцебшчыны ляглі ў аснову унікальных альбомаў, такіх, як «Беларускае народнае адзенне», упрыгожылі першую беларускую энцыклапедыю, далі штуршок працы Міхася Раманюка, які давёў пачатае Баразной да акадэмічнай дасканаласці. Свежыя акварэльныя замалёўкі строяў — лепшыя работы на выставе.

На выставе немагчыма цалкам адлюстраваць імкненне Баразны вярнуць Беларусі веды пра ўласную гісторыю. Ён з нязмушанай інтэлектуальнай свабодай мог выступіць на акадэмічным дыспуце супраць ідэй карыфея савецкай гістарычнай навукі Лаўрэнція Абэцэдарскага.

Падчас абмеркавання ў 1966 годзе навуковых публікацый пра брэсцкага ігумена Апанаса Філіповіча Баразна стаў на бок Міколы Прашковіча і маладых навукоўцаў, што адкідалі аднабаковую масквацэнтрычную схему мінулага.

Адчуваючы неабходнасць глыбейшага вывучэння спадчыны Скарыны, першым як навуковец сістэматызаваў гравюры з выданняў друкара ў альбоме «Гравюры Францыска Скарыны» (1972). Следам за Баразной прыйшоў да вывучэння старадаўняй беларускай кніжнай гравюры яго сябра — вядомы даследчык Віктар Шматаў. Нарэшце, уваходзячы ў нефармальныя аб'яднанні нацыянальнай інтэлігенцыі 1960–1970-х гадоў, у дысідэнцкі гурток «На Паддашку», што збіраўся ў майстэрні Яўгена Куліка, ён не хаваў свайго глыбокага перакнання: Беларусі наканавана адрадзіцца незалежнай дзяржавай.

Таму выстава выставай, але вяртанне поўнага вобраза Лявона Баразны, мастака, даследчыка, патрыёта, — наперадзе.

▾ АГЛЯД

## ПА МУЗЕЯХ І ВЫСТАВАЧНЫХ ЗАЛАХ

### ПАСЛЯСЛЕД

Выстава «Пасляслед» Юрыя Хілько ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр. Незалежнасці, 47, працуе з 16 па 28 лютага) можа быць аднесена да юбілейных — днямі вядомаму графіку, загадчыку кафедры графікі Беларускай акадэміі мастацтваў споўнілася 50 год. Здавалася, яшчэ не так даўно таленавіты вучань выдатных мастакоў-каларыстаў з тонкім адчуваннем фактуры, схільных да эксперыменту з формай — Альгерда Малішэўскага ў Мастацкім вучылішчы, Уладзіміра Савіча і Уладзіміра Басалыгі ў Тэатральна-мастацкім інстытуце, — дэбютаваў на вернісажах у Мінску. Але праімчалася больш за 20 гадоў самастойнай творчасці, за якія неардынарны майстар станковай і кніжнай графікі здабыў агульнае прызнанне. Яго працы пазнавальны дэкаратыўнай фактурнасцю, якая грунтуецца на спалучэнні разнастайных тэхнік і на тонкіх гармоніях насычаных колераў, якія аўтар будуе, адштурхоўваючыся ад рэальных аб'ектаў і паглыбляючыся ў свет пластычных асацыяцый. У выніку паўстаюць выключна насычаныя візуальныя вобразы, аднолькава прываблівыя і ў станковай форме, і ў кніжнай ілюстрацыі, здольныя задаволіць самыя патрабавальныя густы.

### ДЗЁННІКІ ПАДАРОЖЖАЎ

У Гарадской мастацкай галерэі Леаніда Шчамялёва (пр. Ракасоўскага, 49), дзе публіцы рэгулярна прадстаўляюцца паказы беларускага жывапісу XX стагоддзя, з 10 лютага выстаўлена графіка самога заснавальніка галерэі. Экспазіцыя «Дзённікі падарожжаў» прапануе наведвальніку ўвайсці ў творчую майстэрню знакамітага мэтра сучаснага мастацтва, пазнаёміўшыся з замалёўкамі, накідамі, эцюдамі Леаніда Шчамялёва часоў яго творчага сталення — 1960–1970-х гадоў. І часу яго далёкіх падарожжаў ад Сярэдняй Азіі да Крайняй Поўначы. Першапачатковыя накіды цікавыя непасрэднасцю ўражанняў, жывым водарам эмоцый, свежасцю стылю. Графічныя лісты на выставе ў свой час і збіраліся як дзённікі — аўтар адпраўляў іх са сваіх вандровак у Мінск поштай. Рамантыка маладосці суседнічае ў іх з метанакіраванымі пошукамі ўласнага стылю, які паставіў Шчамялёва ў шэраг лепшых жывапісцаў краіны. Шчамялёў па-ранейшаму рэгулярны ўдзельнік жывапісных вернісажаў, але ўбачыць яго графіку выпадае не часта.

### TESTAMENTUM

Нарэшце, у Галерэі Універсітэта культуры (Кастрычніцкая плошча,1) — не зусім звычайная экспазіцыя «Testamentum» — дэкаратыўныя скульптуры маладога кераміста Максіма Калтыгіна (працуе па 20 лютага). Як праз аб'ёмы, пластыку, форму і фактуру керамічных вырабаў можна перадаць атмасферу падзей Старога і Новага Запавету, хрысціянскую сімволіку — адказ чакае гледача ў залах выставы. Зварот да асацыятыўнай вобразнасці вызначае таксама і серыю інсталяцый, фота і аб'ектаў, якія прадставіў у праекце «Numbers & Doors» у Галерэі «Ў» Ігар Корзун (пр. Незалежнасці, 37А, экспануецца па 28 лютага).

**Падрыхтаваў Аляксей Хадыка**

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Аляксей Кароль

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.
ЗАСНАВАЛЬНІК: Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.
ВЫДАВЕЦ: Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.
АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА: 220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org
НАДРУКАВАНА ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 153
Падпісана да друку 19.02.2010. 8.00.
Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.